Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
№ 88 (28704)
11 МАЯ 2018 г.
ПЯТНІЦА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
+TV ПРАГРАМА



**Чаго не хапае Вользе Няфёдавай** МС



**Чыя «нічыйная» маёмасць** МС



**Чым уразяць сталічныя пляжы** МС

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Васіль ЖАРКО, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Сучасныя дэмаграфічныя ўмовы захавання і ўмацавання здароўя насельніцтва з'яўляюцца найважнейшай задачай любой дзяржавы. І эфектыўнасць яе сацыяльнай палітыкі вызначаецца паказчыкам працягласці жыцця грамадзян. Удасканаленне сістэмы аказання тэрапеўтычнай і кардыялагічнай дапамогі насельніцтву, распрацоўка эфектыўных метадаў прафілактыкі, дыягностыкі і лячэння пацыентаў з неінфекцыйнымі захворваннямі набываюць першараднае значэнне».*

# ПРАЗРЫСТА-СОНЕЧНЫ НАСТРОЙ



Жыхарка Гродна Юлія ГАРЧЫЧКА на квітнеючым полі.

Фота БелТА.

## Сем прыступак да ўзаемаразумення

**Гамяльчанін Андрэй Антоненка зусім нечакана для сябе стаў вельмі папулярнай асобай. Са многіх сродкаў масавай інфармацыі пра яго раптам даведаліся тысячы людзей. А ўсё з-за таго, што суседзі па доме адмовілі 27-гадоваму хлопцу ў магчымасці бачыць свет не толькі праз манітор камп'ютара, але і сваімі вачыма.**

Між тым сітуацыя з усталяваннем пад'ёмніка для інваліда, які самастойна не можа перасоўвацца ў прасторы, ідзе да завяршэння. На сённяшні момант з часткай жыхароў дома № 18 па вуліцы Народнага Апалчэння дасягнута дамоўленасць аб іх дазволе на ўсталяванне пад'ёмніка. Добраахвотна-прымусова сабрана неабходная колькасць галасоў «за». Як сумна жартуе сам хлопец, «выйду на вуліцу па амністыі».

СТАР. 4



Тамара і Андрэй АНТОНЕНКІ.

■ З іншага боку

## РАДАСЦІ ПЕНСІЯНЕРА — УНУКІ І ГРАДКІ?

### Чаму гэта не так, і як дапамагчы пажылым захаваць цікавасць да жыцця

**Нядаўна ў сталічным Цэнтры актыўнага даўгалецця спецыяльна для людзей пенсійнага ўзросту прайшло адмысловае мерапрыемства. На ім адбыліся сустрэчы з экспертамі па здаровым ладзе жыцця, прайшлі спартыўныя майстар-класы — заняткі ёгай, гімнастыкай, танцавальным фітнесам спецыяльна для людзей старэйшага ўзросту, якім нярэдка трэба захоўваць асцярожнасць пры фізічных нагрузках. А Мінскае веласіпеднае таварыства арганізавала экспрэс-навучанне яздзе на веласіпедзе для дарослых і расказала, якую карысць для здароўя ён прыносіць...**

«Старэнне — гэта не заўсёды сінонім немачы і хваробы, і жыццё пасля выхаду на пенсію можа і павінна быць поўным уражанняў, у тым ліку падораных спортам», — лічыць **дырэктар Цэнтра актыўнага даўгалецця Дзмітрый КЛІМКОВІЧ**. І шматлікія наведвальнікі, а калі дакладней, большай часткай наведвальніцы, што запоўнілі цэнтр у гэты дзень, цалкам з ім згодныя. Многія з іх і на пенсіі вядуць актыўны лад жыцця — вывучаюць камп'ютар і замежныя мовы, падарожнічаюць, займаюцца краязнаўствам, ходзяць на заняткі танцамі і ў паходы.

Але давайце паглядзім праўдзе ў вочы — такой актыўнай з'яўляецца толькі малая частка пажылых беларусаў. Так, яны разбіваюць нашы стэрэатыпныя ўяўленні пра жыццё на пенсіі, але нам нікуды не дзецца ад таго факта, што значная колькасць людзей сталага ўзросту, на жаль, гэтым стэрэатыпам адпавядае. Некаторыя прывыклі быць пасіўнымі, а з узростам яшчэ сталі з асцярогай ставіцца да ўсяго новага. І яны ўжо дакладна не пойдуць ні на які майстар-клас ці гурток. І тым больш, калі за яго яшчэ трэба плаціць.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

# БЕЗ СТРАТ І БЕЗ ДАТАЦЫЙ

**На нарадзе ў Прэзідэнта ўчора разглядаўся далейшы лёс прадпрыемства «Гродна Азот». Гэта стала нагодай абмеркаваць і іншыя буйныя інвестыцыйныя праекты краіны, у тым ліку будаўніцтва АЭС. Закранулі і пытанні, якія, як раней акрэслівалася, патрабуюць пэўнай увагі, напрыклад вытворчасць спартыўнага інвентару і музычных інструментаў.**

Што датычыцца менавіта «Гродна Азота», Прэзідэнт падтрымаў ідэі, якія яму прапанавалі, а менавіта: мадэрнізацыі існуючай вытворчасці і будаўніцтва новай. Зараз ідзе прапрацоўка абодвух варыянтаў і ацэнка рызык. У Беларусі выпрацоўваюцца асноўныя мінеральныя ўгнаенні, якія выкарыстоўваюцца перш за ўсё ў сельскай гаспадарцы. «Але «Гродна Азот» важны і значны не толькі для хімічнай галіны рэгіёна, але і для краіны цалкам», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Улічваючы тое, што колькасць насельніцтва пастаянна расце, запыт на сельскагаспадарчую прадукцыю будзе павялічвацца. Пры гэтым наша планета не гумавая: неабходна выкарыстоўваць існуючыя плошчы. «Таму актуальнасць павелічэння вытворчасці мінеральных угнаенняў пастаянна будзе расці», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

На вытворчасцях «Гродна Азота» выпрацоўваюцца азотныя ўгнаенні, аміяк, метанол, капралактам і іншая хімічная прадукцыя. «Больш за палову выпрацаваных азотных угнаенняў пастаўляецца для сельскагаспадарчых арганізацый краіны, таму яго стабільная работа непасрэдна звязаная з эфектыўнасцю прадпрыемстваў галіны», — звярнуў увагу Прэзідэнт. Пры гэтым ён папрасіў далажыць, колькі азотных угнаенняў імпартуецца ў Беларусь. «Магутнасці гэтага камбіната адпрацавалі больш за 30 гадоў і выпрацоўваюць практычна ўжо другі рэсурс. Тэхналогіі, якія выкарыстоўваюцца ў нас сёння на гэтым камбінаце, не дазваляюць паўнавартасна канкурыраваць з замежнымі вытворцамі аналагічнай прадукцыі. Таму ўзнікла аб'ектыўная неабходнасць сур'ёзнай мадэрнізацыі гэтага прадпрыемства», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Разглядаліся тры варыянты: мадэрнізацыя існуючай вытворчасці, будаўніцтва новай і рэалізацыя гэтых двух праектаў адначасова. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што галоўнае разлічыць, куды прадаваць прадукцыю і па якіх цэнах закупляць сыравіну. «Ёсць меркаванне, што кожны з гэтых варыянтаў звязаны з пэўнымі рызыкамі, якія могуць аказаць істотны ўплыў на эфектыўнасць праекта. Таму мы павінны ўважліва разгледзець усе аспекты і прыняць узважанае рашэнне, нацэленае на доўгатэрміновую перспектыву, — лічыць кіраўнік дзяржавы. — Мае патрабаванні вам вядомыя: ніякіх стратных і датацыйных праектаў у краіне быць не павінна».

Старшыня канцэрна «Белнафтахім» Ігар Ляшэнка пасля нарады адзначыў для журналістаў, што Прэзідэнту было далажана пра напрацоўкі па будаўніцтве новага азотнага комплексу. Вялікая ўвага была ўдзелена разгляду рызык рэалізацыі праекта, кошт якога складае крыху больш за $1 млрд. Выручку разлічваюць атрымліваць у памеры каля $335 млн у год. Далейшая прапрацоўка праекта ідзе ў кірунку сыравінных рызык (кошту газу) і кошту крэдытных рэсурсаў. Калі гаварыць пра варыянт глыбокай мадэрнізацыі, то на гэта плануецца задзейнічаць уласныя сродкі і пазыкі прадпрыемства. Увогуле гэтыя праект ацэньваецца ў суму каля $400 млн.

Гендырэктар «Гродна Азота» Ігар Бабыр нагадаў, што прадпрыемства складаецца з дзвюх пляцовак: «Гродна Азот» і «Завод Хімвалакно». У 2016-м сур'ёзна ўзраслі выдаткі, звязаныя з закупкай сыравіны, летась вытворчасць выйшла на бясстратную работу, а сённяшнія ўмовы, на думку гендырэктара, даюць падставы для таго, каб выйсці ў плюс і аднавіць плацежаздольнасць. Пры гэтым будаўніцтва новага комплексу дасць магчымасць пастаянна прысутнічаць на экспартных рынках з доўгатэрміновымі кантрактамі. А на мадэрнізаванай вытворчасці будзе магчымасць ствараць новыя віды ўгнаенняў.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

■ Дыялог бізнесаў

# Японскія перспектывы

**Першы беларуска-японскі эканамічны форум праходзіць у Японіі. Ён праводзіцца з 9 па 11 мая ў Токіа і Осака. У мерапрыемстве ўдзельнічаюць больш за 200 бізнесменаў з дзвюх краін. На форуме праходзяць двухбаковыя сустрэчы на міністэрскім і рэгіянальным узроўнях, панэльныя дыскусіі, кантактна-кааперацыйныя біржы.**

Беларуская дэлегацыя наведвае вядучыя японскія кампаніі і бізнес-асацыяцыі. На форуме таксама арганізавана міні-выстаўка беларускіх тавараў. Удзельнікі мерапрыемства могуць азнаёміцца з экспазіцыяй кніг пра Беларусь, а таксама наведаць канцэрт беларускай дыяспары ў Японіі.

Як расказаў БелТА **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Японіі Руслан ЕСІН**, сярод беларускіх удзельнікаў форуму ёсць прадстаўнікі прадпрыемстваў цяжкай і лёгкай прамысловасці, вытворцы фармацэўтычнай прадукцыі, мяса-малочнай і кандытарскай галін. Частка гэтых беларускіх кампаній ужо паспяхова супрацоўнічае з японскімі партнёрамі, але некаторыя прадпрыемствы робяць свае першыя крокі па выбудоўванні адносін. Пасол таксама адзначыў, што, нягледзячы на тое, што аб заключэнні кантрактаў пакуль гаварыць рана, японскі рынак для беларускіх прадпрыемстваў з'яўляецца перспектыўным. Паводле яго слоў, у працэсе прасоўвання беларускіх тавараў у Японію мясцовыя спажыўцы прынялі іх пазітыўна. У тым ліку размова ідзе і аб харчовай прадукцыі: сырах, алкаголі, кандытарскіх вырабах, шакаладзе ■

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## FORBES НАЗВАЎ СІ ЦЗІНЬПІНА САМЫМ УПЛЫВОВЫМ ЧАЛАВЕКАМ У СВЕЦЕ



Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін упершыню за пяць гадоў саступіў лідарства ў спісе самых уплывовых людзей свету па версіі Forbes. У абноўленым рэйтынгу, прадстаўленым на сайце выдання, на першым месцы размясціўся старшыня КНР Сі Цзіньпін. Пуцін зрушыўся на другую пазіцыю, а прэзідэнт ЗША Дональд Трамп стаў трэцім. У дзясятку рэйтынга таксама ўвайшлі канцлер Германіі Ангела Меркель, заснавальнік Amazon Джэф Безас, Папа Рымскі Францыск, заснавальнік Microsoft Біл Гейтс, наследны прынц Саудаўскай Аравіі Мухамед бен Сальман, прэм'ер Індыі Нарэндра Модзі, сузаснавальнік Google Лары Пэйдж.

## У МАЛАЙЗІІ ПАДВЯЛІ ВЫНІКІ ПАРЛАМЕНЦКІХ ВЫБАРАЎ

Апазіцыйная кааліцыя Малайзіі «Альянс надзеі» атрымала простую большасць у парламенце па выніках праведзеных парламенцкіх выбараў, сведчаць даныя на сайце выбарчай камісіі краіны. «Партыя народнай справядлівасці» атрымала 104 парламенцкія крэслы, «Партыя дэмакратычнага дзеяння», якая таксама выступала на выбарах у складзе аб'яднання, — дзевяць крэслаў. Такім чынам, апазіцыйная кааліцыя па выніках галасавання займе 113 месцаў у заканадаўчым органе краіны, кіраўнічы «Нацыянальны фронт» — 79. Дарэчы, для фарміравання ўрада партыі неабходна атрымаць 112 парламенцкіх крэслаў.

## ТРАМП І КІМ ЧЭН ЫН СУСТРЭНУЦЦА Ў СІНГАПУРЫ

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп і кіраўнік КНДР Кім Чэн Ын правядуць перагаворы ў Сінгапуры, паведамляе CNN са спасылкай на крыніцы ў адміністрацыі Белага дома. Чыноўнікі ўжо атрымалі адпаведныя распараджэнні і інструкцыі па падрыхтоўцы сустрэчы. У найбліжэйшыя дні Вашынгтон павінен афіцыйна абвясціць пра месца і час перагавораў Трампа з Кім Чэн Ынам. Горад для гістарычнай сустрэчы абраны невыпадкова. З аднаго боку, у Сінгапура даўнія сувязі з ЗША, а з другога, у горадзе ёсць пасольства Паўночнай Карэі. ЗША раней адхілілі варыянт сустрэчы Трампа і Кім Чэн Ына ў памежным Пханмунджоме ў дэмілітарызаванай зоне паміж КНДР і Рэспублікай Карэя.

## ГУБЕРНАТАР ГАВАЯЎ АБВЯСЦІЎ РЭГІЁН ЗОНАЙ СТЫХІЙНАГА БЕДСТВА

Губернатар штата Гаваі Дэвід Ігэ абвясціў раён Пуна зонай стыхійнага бедства ў сувязі з наступствамі вывяржэння вулкана Кілаўэа на ўсходзе вострава. Пра гэта гаворыцца ў «Твітэры» кіраўніка штата. Як паведаміў губернатар на прэс-канферэнцыі, дапамога федэральнага ўрада можа спатрэбіцца для эвакуацыі жыхароў з дапамогай верталётаў, якіх у Гаваяў няма ў дастатковай колькасці. Акрамя таго, падтрымка патрэбная, каб звесці да мінімуму шкоду эканомікі вострава і аператыўна ліквідаваць наступствы стыхіі. Геалагічная служба ЗША папярэдзіла, што на працягу найбліжэйшых тыдняў можа адбыцца чарговае вывяржэнне Кілаўэа. Дарэчы, гэта самы малады з наземных гавайскіх вулканаў і адзін з найбольш актыўных дзейных вулканаў на Зямлі.

## Мікалай ШАРСНЁЎ:

# «Будучыня за інтэграцыйнымі структурамі»



**Старшыня Віцебскага аблвыканкама падчас прэс-канферэнцыі расказаў пра тое, якой бачыць будучыню сельскай гаспадаркі, як на вёсцы замацаваць кадры, пра рамонт дарог і іншае.**

### Справы вёскі

Разважаючы пра сельскагаспадарчую галіну, старшыня аблвыканкама падкрэсліў, што створаныя аграрныя холдынгі (віцебскі, глыбоцкі, аршанскі, полацкі) працуюць і развіваюцца эфектыўна.

— На сёння кожны мае больш за 70 тысяч гектараў ралллі. У іх склад увайшлі буйныя свінакомплексы, комплексы па адкорме буйной рагатай жывёлы, — адзначыў губернатар.

Адпаведны ўказ Прэзідэнта дазволіў аб'яднаць у адно цэлае вытворчасць, перапрацоўку і рэалізацыю гатовай прадукцыі. Такім чынам, з'явілася магчымасць працаваць па прынцыпе «ад поля да прылаўка».

Далучэнне стратных гаспадарак да гэтых інтэграцыйных структур дазваляе падтрымаць іх. Бо тут цэнтралізавана купляюцца новая тэхніка, угнаенні, паліва, вырашаюцца кадравыя пытанні.

Дарэчы, наконт кадраў. У чарговы раз губернатар агучыў гэтую праблему. Напрыклад, у акадэміі ветэрынарнай медыцыны каля 70 % студэнтаў — гараджане. Наўрад ці яны мараць працаваць у глыбінцы. Таму неабходна, каб у навучальных установах аграрнага профілю вучылася больш прадстаўнікоў вясковай моладзі. А для замацавання іх на першых працоўных месцах, плануецца значна павысіць ім заробкі. У прыватнасці, «Звязда» ўжо паведамляла, што ўжо зроблена ў жывёлагадоўлі, каб работнікі маглі зарабіць удвая больш.

Як падкрэсліў старшыня аблвыканкама, потым аналагічны падыход будзе рэалізаваны і па іншых напрамках сельскагаспадарчай вытворчасці. А далей — у іншых сферах: медыцыны, адукацыі і г. д. Плануецца вызначыць прыярытэтныя спецыяльнасці, запатрабаваныя на рынку працы.

Але кадры павінны адпавядаць сучасным рэаліям прафесійных патрабаванняў. Таму акцэнт падчас навучання робіцца на павелічэнне колькасці практычных заняткаў. Напрыклад, на пасяўную запрасілі каля 700 будучых механізатараў. Наогул, калі раней практыка ў іх доўжылася пяць тыдняў, цяпер — 2,5 месяца.

— Чаму дзяўчына за тры месяцы на курсах атрымлівае пасведчанне кіроўцы, а хлопца на механізатара вучым 2,6 года? Пры гэтым ён не ведае новай тэхнікі, сельскагаспадарчых агрэгатаў? — разважае Мікалай Шарснёў.

Трэба карэнным чынам мяняць падыходы ў навучанні, лічыць кіраўнік вобласці.

Што датычыцца збыту, на думку губернатара, у перспектыве павінна працаваць адна кампанія, якая павінна прадстаўляць сельскагаспадарчую прадукцыю вобласці. Гэта дазволіць эфектыўна канкурыраваць, каардынаваць работу асобна ўзятых прадпрыемстваў, каб яны не перашкаджалі адзін аднаму ў пошуку спажыўцоў.

### Дарогі трэба рамантаваць

Губернатар адказаў і на пытанне наконт рамонту дарог. Сёлета і ў наступныя пару гадоў прадугледжваецца рамонт амаль тысячы кіламетраў. Віцебшчына — адзіная вобласць у краіне, дзе дарога ў бок сталіцы не адпавядае сучасным патрабаванням.

— І ўвогуле, да Оршы трэба таксама пракласці сучасную дарогу, — падзяліўся думкамі губернатар.

Таксама ён закрануў тэму развіцця турыстычнай інфраструктуры. У прыватнасці, у вобласці каля дзвюх тысяч азёр.

— А на якое можна прыехаць з сям'ёй, каб адпачыць культурна: пакатацца на лодцы, пазагараць у добрых умовах? У гэтым пытанні яшчэ шмат чаго трэба зрабіць! — адзначыў губернатар.

Каб прыцягнуць інвестараў у турыстычную галіну, трэба ствараць інфраструктуру, упэўнены старшыня аблвыканкама, напрыклад, добраўпарадкаваць прыбярэжныя тэрыторыі.

Ён нагадаў, што на Віцебшчыне колькасць аграрных сядзіб перавысіла 600. І яны вельмі запатрабаваныя землякамі і гасцямі з іншых абласцей, з замежжа.

— Прэзідэнт асабіста заклікаў развіваць сельскі турызм. І каб гаспадары плацілі мінімальны падатак. Час паказаў, што былі выбраны правільны падыход у гэтым кірунку, — падкрэсліў Мікалай Шарснёў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ДЗЕЛЯ РАЗУМЕННЯ ТВОРЧЫХ ПРАЦЭСАЎ

**Міністэрства інфармацыі і Беларускі саюз мастакоў заключылі пагадненне аб супрацоўніцтве.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Дакумент мае на мэце папулярызацыю сучаснага мастацтва і павышэнне агульнага культурнага ўзроўню насельніцтва праз сумесныя праекты. Пра гэта расказаў **міністр інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ**.

— Пагадненне арыентуе нас на сумесную працу, звязаную з грамадска-сацыяльнымі праектамі, якія асвятляюцца медыйнай супольнасцю, і з той сацыяльнай і творчай работай, якая разглядаецца ў межах працы Беларускага саюза мастакоў. Як прыклад: з дапамогай СМІ нам удалося прыцягнуць грамадскасць да распрацоўкі талісмана II Еўрапейскіх гульняў. Зараз мы спадзяёмся, што пэўныя карэктывы ў ідэю талісмана ўнясуць прафесійныя мастакі. На чарзе таксама цэлы шэраг агульных конкурсаў, якія атрымаюць такую ж шырокую інфармацыйную падтрымку, — запэўніў міністр.

**Рыгор СІТНІЦА, старшыня Беларускага саюза мастакоў**, адзначыў, што пагадненне найперш дасць грамадству веды і разуменне мастацкіх працэсаў, якія ў нас адбываюцца ў краіне. Гэта асабліва актуальна, бо сёння большасць жыхароў краіны адарвана ад сучасных павеваў выяўленчага мастацтва. Катастрафічна не хапае якаснай аналітыкі, якая разглядала б творчасць у гістарычным і агульнакультурным аспектах. Між тым многа працы зроблена ў асвятленні мастацкіх працэсаў і трэба, каб занятыя ў гэтым кірунку людзі адчулі падтрымку і вартасць сваёй працы.

З азначанай праблемы нарадзілася ідэя рэспубліканскага творчага конкурсу на найлепшае асвятленне ў СМІ тэмы мастацтвазнаўства і мастацкай крытыкі. Да ўдзелу ў ім прымаюцца работы, апублікаваныя ў СМІ, альбо сюжэты, якія выйшлі ў тэлевізійны ці радыёвяшчальны эфір, а таксама матэрыялы, размешчаныя на сайтах у даменнай зоне .by на працягу 2018 года на беларускай або рускай мове.

— Усяго намі вылучана чатыры намінацыі. За асабісты ўклад будуць ушанаваныя дзеячы, што значную частку жыцця і сіл прыклалі на асвятленне і вывучэнне працэсаў выяўленчага мастацтва. У другой і трэцяй намінацыях плануем узнагароджваць аўтараў за аналітычнае асвятленне мастацкай падзеі або за аналітычнае асвятленне творчасці пэўнай асобы. Чацвёртая намінацыя будзе звязана з разглядам навуковых работ у галіне мастацтвазнаўчай крытыкі, — паведаміў старшыня Беларускага саюза мастакоў.

Умовы конкурсу будуць размешчаны на сайтах Беларускага саюза мастакоў і Міністэрства інфармацыі. Пераможцы акрамя дыпломаў могуць разлічваць і на матэрыяльную ўзнагароду.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**

## МІНГАРВЫКАНКАМ І АБЛВЫКАНКАМЫ ЗАЎСЁДЫ НА СУВЯЗІ

**Традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі пройдуць у суботу, 12 мая, з 9.00 да 12.00. Іх правядуць:**

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Алег Іванавіч ВЯЛІЧКА. Тэл. 8 016 221 31 21;

кіраўнік спраў ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч СЫСОЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ПРЫВАЛАЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Віктар Андрэевіч ЛІСКОВІЧ. Тэл. 8 015 273 56 44;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Андрэй Міхайлавіч КУНЦЭВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Віктар Іванавіч СІРЭНКА. Тэл. 8 017 500 41 60;

першы намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Фёдар Віктаравіч РЫМАШЭЎСКІ. Тэл. 8 017 222 44 44.

■ Супрацоўніцтва

## Завод пагрузчыкаў і кітайскія інвестыцыі

### Будаўніцтва новага прадпрыемства «Амкадор-Маш» пачалося ў пасёлку Калодзішчы Мінскага раёна

**У цырымоніі закладкі капсулы ў падмурак будучага завода прынялі ўдзел першы намеснік прэм'ер-міністра Васіль Мацюшэўскі, памочнік Прэзідэнта Беларусі Аляксандр Косінец, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Мінскай вобласці Ігар Яўсееў, старшыня Дзяржкаммаёмасці Андрэй Гаеў, старшыня Мінаблвыканкама Анатоль Ісачанка, пасол Кітая ў Беларусі Цуй Цымін і іншыя.**

Генеральным падрадчыкам будаўніцтва завода выступае CITIC Construction — даччыная кампанія карпарацыі CITIC Group, адной з найбуйнейшых дзяржаўных інвестыцыйных кампаній Кітая. «Амкадор-Маш» будзе выпрацоўваць франтальныя і ўніверсальныя пагрузчыкі грузападымальнасцю 2—5 тон, пагрузчыкі з тэлескапічнай стралой, трактары з шарнірна-сучлененай рамай магутнасцю 250—600 конскіх сіл. На новым заводзе будуць выпускаць і гатовыя машынакамплекты для зборачных вытворчасцяў холдынга «Амкадор».

Планаваны сабекошт праекта складае каля 230 млн долараў, магутнасць вытворчасці — каля 6 тысяч машын у год. Прэзідэнт карпарацыі Ван Цзюн падкрэсліў, што будаўніцтва завода паслужыць бліскучым прыкладам супрацоўніцтва дзвюх краін і адкрые новыя старонкі ў летапісе кітайска-беларускага сяброўства.

Старшыня савета дырэктараў таварыства «Амкадор» — кіруючая кампанія холдынга» Аляксандр Шакуцін адзначыў, што завод плануецца ўвесці ў эксплуатацыю на працягу двух, магчыма, паўтара года. «Будзе выпускацца эксклюзіўная прадукцыя, яе плануецца ў асноўным экспартаваць у краіны Еўразаюза, Азію, Афрыку, краіны былога Савецкага Саюза», — дадаў ён. Аляксандр Шакуцін таксама выказаў упэўненасць, што новае прадпрыемства стане адным з сімвалаў паспяховага ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва Беларусі і Кітая.

Праект прадугледжвае стварэнне 1350 працоўных месцаў. У бягучым годзе плануецца пабудаваць пяціпавярховы дом для работнікаў будучага прадпрыемства.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Чулі?!

## Спартсмены прагаласавалі за Домрачаву

**Чатырохразовая алімпійская чэмпіёнка атрымала прыз за спартыўную высакароднасць ад Міжнароднага саюза біятланістаў (IBU).**

Гэтую ўзнагароду было вырашана ўручыць Дар'і па выніках галасавання атлетаў, якія выступаюць на Кубку свету. «Дар'я Домрачава атрымала прыз за спартыўную высакароднасць дзякуючы свайму ўчынку на этапе Кубка свету ў італьянскім Антхольцы», — растлумачылі ў IBU. Аналагічнага прыза таксама ўдастоіўся нарвежац Яханэс Цінэс Бё. Нагадаем, падчас гонкі праследу Дар'я Домрачава і італьянка Даратэя Вірэр змагаліся за другое месца пасля заключнай стральбы. Перад паваротам на фініш беларуска наступіла на лыжную палку Даратэі, і тая засталася толькі з адной. Дар'я Домрачава, убачыўшы гэта, вырашыла не апярэджваць італьянку і фінішавала трэцяй.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**


Фота БелТА.

■ Абітурыент-2018

## НА «ПРАКТЫЧНУЮ ПСІХАЛОГІЮ» БЕЗ ЦТ НЕ ПАСТУПІШ

### Што змянілася для выпускнікоў педагагічных класаў?

**Пералік педагагічных спецыяльнасцяў, на якія выпускнікі профільных педагагічных класаў і груп маюць права паступаць без уступных іспытаў, быў скарочаны. Адпаведнае рашэнне змяшчаецца ў пастанове Міністэрства адукацыі № 24 ад 14 красавіка 2018 года, апублікаванай на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.**

Нагадаем, што летась упершыню навучэнцы педагагічных класаў і груп атрымалі права паступаць у ВНУ на 38 педагагічных спецыяльнасцяў без здачы ЦТ, толькі па выніках гутаркі. Праўда, такая льгота давалася не ўсім, а толькі тым з выпускнікоў профільных педкласаў, у кагоў атэстаце па ўсіх прадметах былі адзнакі ад 7 да 10 балаў, а па профільных прадметах, якія вывучаюцца на павышаным узроўні, — не менш як 8 балаў. Гэта патрабаванне задавала даволі высокую планку. Да таго ж вучні павінны былі атрымаць для паступлення разгорнутую характарыстыку-рэкамендацыю педагагічнага савета установы адукацыі.

На калегіі Міністэрства адукацыі, дзе падводзіліся вынікі прыёмнай кампаніі, рэктар БДПУ Аляксандр ЖУК паведаміў, што ў 2017 годзе студэнтамі ВНУ сталі 672 выпускнікі педагагічных класаў з 1350 чалавек, гэта значыць палова. З іх 369 чалавек (каля 55 %) вучацца ў ВНУ, якія рыхтуюць спецыялістаў для сістэмы адукацыі. Непасрэдна на педагагічныя спецыяльнасці паступілі 230 выпускнікоў педкласаў, дзве трэціны з якіх скарысталіся правам льготнага паступлення (166 чалавек, або 72 %). Адпаведна, амаль трэціна (64 чалавекі) была залічана на педагагічныя спецыяльнасці па выніках ЦТ.

Правам паступаць без экзаменаў у галоўны педагагічны ўніверсітэт краіны скарысталіся 107 выпускнікоў педагагічных класаў, і яшчэ 23 чалавекі паступілі ў БДПУ па выніках цэнтралізаванага тэсціравання. Магчыма, кагосьці адмовіцца ад ільготы прымусіла перспектыва пяцігадовай абавязковай адпрацоўкі на тым месцы, куды цябе размяркуюць... Гэта даволі жорсткая ўмова, якая ставіць вельмі моцных абітурыентаў на адну планку з «мэтавікамі», хоць тыя часта маюць далёка не самыя высокія балы. Дарэчы, сярэдні бал атэстата ў выпускнікоў педкласаў, якія паступалі ў БДПУ, быў ад 8 да 9,8 бала (8 з іх былі ўзнагароджаны медалямі).

Рашэнне аб скарачэнні пераліку педагагічных спецыяльнасцяў, на якія можна паступаць без экзаменаў (па выніках гутаркі), стала для многіх нечаканасцю, тым больш што рэгістрацыя на ЦТ ужо распачалася. У прыватнасці, з мінулагодняга пераліку зніклі 8 спецыяльнасцяў: «Гісторыя і сусветная мастацкая культура», «Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа», «Выяўленчае мастацтва і камп'ютарная графіка», «Музычнае мастацтва, чарчэнне і народныя мастацкія промыслы», «Музычнае мастацтва, рытміка і харэаграфія», «Музычнае мастацтва і сусветная мастацкая культура», «Лагапедыя» і «Практычная псіхалогія». Разам з тым у пераліку засталіся, напрыклад, такія спецыяльнасці, як «Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны», «Сурдапедагогіка» і «Тыфлапедагогіка», «Сацыяльная і псіхолага-педагагічная дапамога», дзе конкурсы звычайна меншыя.

У любым выпадку ўсім абітурыентам варта паўдзельнічаць у ЦТ, бо гэта найлепшы спосаб пагладзець на свае дасягненні на фоне іншых прэтэндэнтаў на студэнцкі білет. Да таго ж, маючы на руках сертыфікаты, можна адчуваць сябе больш упэўнена і выбіраць паміж ВНУ, бо тая ж «гісторыя» ёсць не толькі ў БДПУ: гісторыкаў рыхтуюць і ў БДУ, і ў рэгіянальных універсітэтах.

А тым, хто ўсё ж вырашыць скарыстацца льготай, варта нагадаць, што тэрміны падачы дакументаў для выпускнікоў профільных класаў педагагічнай накіраванасці, якія паступаюць на педагагічныя спецыяльнасці пасля праходжання гутаркі, — з 12 па 14 ліпеня (як для асоб, якія паступаюць на «бюджэт», так і на платнай аснове). У 2018 годзе педагагічныя класы і групы выпускаюць 2230 сваіх выхаванцаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

■ Надвор'е

## А раніцай яшчэ халаднавата

### Але ўдзень на выхадныя прыгрэе да плюс 25 градусаў

**У наступныя двое сутак уплыў на характар надвор'я ў нашай краіне будзе аказваць антыцыклон, які раскінуўся над паўночна-заходнімі раёнамі еўрапейскай часткі Расіі. Антыцыклон сфарміраваны ў халаднаватым паветры, так што ў паўночна-ўсходніх раёнах нашай краіны па начах будзе даволі свежа, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння ўдзень будзе пераважна без ападкаў. Максімальная тэмпература паветра ад плюс 18 да плюс 24 градусаў. І ў суботу будзе пераважна без ападкаў, толькі ўдзень у асобных раёнах па паўднёвым усходзе Гомельскай вобласці магчымы кароткачасовыя дажджы. Раніцай у гэты дзень будзе сапраўды некамфортна, бо халаднавата. Тэмпература паветра ўначы складзе ўсяго плюс 3—8 градусаў, але ўдзень будзе ўжо ад плюс 20 да плюс 25 градусаў.

У нядзелю пасвяжэе і ўдзень. Так, 13 мая, пад уплывам атмасферных франтоў уначы ў паўднёва-ўсходніх раёнах, а днём на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі прагрымяць навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 6—12 цяпла, а ўдзень будзе знаходзіцца ў межах ад плюс 16 па паўднёвым усходзе да плюс 23 градусаў па паўночным захадзе краіны.

**Сяргей КУРКАЧ**

# Сем прыступак да ўзаемаразумення

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Намеснік кіраўніка адміністрацыі Чыгуначнага раёна Гомеля Надзея Куніцкая паведаміла, што ўжо знойдзена прадпрыемства, якое стане спонсарам усталявання механізма ў пад'ездзе, дзе жыве малады чалавек:

— Зварот Андрэя ўзяў пад асабісты кантроль старшыня Гомельскага гарвыканкама Пётр Кірычэнка. Мы правялі тлумачальную работу з грамадзянамі, яны ўсё зразумелі. Праз хуткі час Андрэй зможа выязджаць на свежае паветра без праблем.

Хлопец дагэтуль выходзіць на вуліцу з дапамогай маці. Раней яна выносіла сына на руках і перасаджвала ў крэсла каля пад'езда. Але апошнім часам гэта стала зусім цяжка. Уявіце: малады мужчына важыць каля 80 кг + каляска 13 кг.

— Для нас на вуліцу выйсці — гэта сапраўднае выпрабаванне, — гаворыць маці Тамара Іванаўна. — Я, калі яго каляску скочваю, такое адчуванне, што ўрэшце разам звалімся. Падняцца — гэта наогул праблема. З-за таго, што ён трохі можа сам на нагах стаяць, я яго паднімаю па прыступках, стаўлю каля парэнчаў, бягу па каляску ўніз — гэта словамі не перадаць...

Тры гады таму сям'я пачала прасіць усталяваць пад'ёмнік у пад'ездзе, каб без пакут і неймаверных намаганняў пераадольваць сем прыступак на першым паверсе. Спачатку ў раённым камунальным прадпрыемстве ім адмовілі. Кватэра была афармлена на бацьку, а Андрэй у ёй не быў зарэгістраваны. Бацька памёр, і хлопец уступіў у правa на спадчыну. Юрыдычны бок праблемы вырашаны, але суседзі па пад'ездзе выступілі супраць пад'ёмніка. Паколькі дом, у якім усе 27 гадоў пражывае хлопец, кааператыўны, для мантажу абсталявання неабходна згода ўсіх жыхароў шматкватэрнага дома, а не толькі пад'езда.

Насупраць дома, дзе жыве Андрэй, радком на лаўцы сядзяць мужчыны пенсійнага ўзросту. У момант, калі яго маці Тамара Іванаўна выкочвае каляску з хлопцам на вуліцу, яны аўтаматычна назіраюць за дзеяннем. Ні ў кога не ўзнікае жадання — нават пасля закліку — падысці, дапамагчы, нават тады, калі працэс паўтараецца ў адваротны бок. На пытанне, чаму яны супраць пад'ёмніка, адказваюць, адводзячы вочы:

— Мне ўсё роўна, але я супраць.

— Няхай робяць, толькі нічога не ламаюць.

— Галоўнае, каб у нас потым праблем не было.

— Каб нам было зручна.

— Там жа дзверы будуць змяшчаць.

— Нам усё роўна, а хто будзе плаціць?

— У іншых стаўце, а ў нас не трэба.

— Гэтыя пад'езды не прыстасаваныя да ўсталявання пад'ёмніка — няўжо не зразумела?

Між тым ніхто з іх рэальна так і не ўяўляе, як пад'ёмнік выглядае насамрэч. Пры гэтым прадстаўнікі ўлады на сходзе паказвалі ім узоры, растлумачвалі, што плаціць не прыйдзецца і канструкцыйных зменаў не будзе. Спрацаваў эфект масавай свядомасці, лічыць старшы выкладчык кафедры філасофіі, гісторыі, паліталогіі Беларускага ўніверсітэта транспарту, псіхолаг Таццяна Сасноўская:

— Спрацаваў эфект натоўпу. Нехта нешта сказаў, і ўсе астатнія далучыліся да таго, што недзе пачулі, і пачалі перадаваць адно аднаму. Навошта астатнім умешвацца і ісці супраць натоўпу?

А вось ужо зусім іншая сітуацыя ў іншым кааператыўным доме, дзе жыве гамяльчанка Алена Гербаносенка. Дзяўчына па прычыне хваробы чацвёрты год перасоўваецца на калясцы. Алена спецыяльна для нас дэманструе, як працуе пад'ёмнік, аналагічны якому будуць усталёўваць у пад'ездзе Андрэя. Механізм выступае ад сцяны на 10 сантыметраў і, як аказалася, нікому не перашкаджае. Дзяўчына кажа, што суседзі ставяцца да сітуацыі з разуменнем:

— Мне таксама даваліся «прабівацъ» дазвол на пад'ёмнік. У нас старшыня кааператыва хадзіла па пад'ездах і пераконвала людзей. Толькі некалькі чалавек не згадзіліся, але абсалютная большасць пайшла насустрач.

Тут жа ў пад'ездзе Алены мы спыняем імклівую жанчыну ў дамашнім адзенні. Ірына шчыра здзіўляецца, што нехта можа быць супраць механізма, які робіць больш зручным жыццё інваліда.

І ўсё ж застаецца шэраг пытанняў, чаму такі доўгі і няпросты аказваецца шлях да інклюзіі не на паперы, а ў сапраўдным жыцці. Сёння слова «інклюзія» стала модным і ўжываецца паўсюдна. Даволі часта ўжо можна пабачыць, што перарабляюцца ўваходы каля крам і іншых грамадскіх будынкаў — з улікам наведвання іх людзьмі з абмежаванымі магчымасцямі. Дарэчы, працэс рэальнага ўключэння людзей з інваліднасцю ў актыўнае грамадскае жыццё прадугледжвае распрацоўку і ўжыванне пэўных рашэнняў.

А вось з гэтым існуюць праблемы. Ёсць законы, падзаконныя акты, матэрыяльныя (не)магчымасці, але ёсць і людзі. Тыя, каму пашанцавала не быць інвалідам. Іх не пераробіш толькі заклікам да міласэрнасці. Самы распаўсюджаны меседж-зварот да такіх, у тым ліку і ў інтэрнэце: «Ніхто не ведае, што з табой ці тваімі сваякамі будзе заўтра! Ніхто ад інваліднасці не застрахаваны!». Заклік не спрацоўвае. Чаму?

— «Усе памруць, а я застануся». Людзі вераць у сваю асабістую бессмяротнасць, — растлумачвае асаблівасці такога стаўлення псіхолаг Таццяна Сасноўская.

Між тым вельмі многім людзям сем ці пяць прыступак у пад'ездзе не дазваляюць мець стасункі са светам. Тым, каму яны асабліва неабходныя. Абмежаванняў у іх жыцці больш чым дастаткова. Гэта датычыцца, аднак, не толькі саміх інвалідаў, але і іх сваякоў, непасрэдна звязаных адным ланцугом з тымі, каму лёс наканаваў крыху адрознівацца ад іншых. Гэта значна ўплывае на псіхічныя працэсы, а не толькі на фізіялогію, гаворыць Таццяна Сасноўская:

— Такому чалавеку цяжка ўсё жыццё. У вас ёсць дзеці, якія апраўдваюць вашы чаканні. Хворае дзіця — гэта дзіця, якое не будзе цябе радаваць. Ты яму служыш без аддачы. Ты будзеш радавацца толькі таму, што яно не памерла і што яму сёння трохі лепш, чым учора. Тым, хто даглядае інвалідаў, штодзень трэба знаходзіць у сабе мужнасць. У іх ніколі не будзе цудоўнага заўтра. У іх штодзень — «дзень сурка». Гэтыя гераічныя людзі перманентна знаходзяцца ў дэпрэсіі, у напружанні.

Асноўная праблема стасункаў у тым, што людзі не супрацоўнічаюць, а змагаюцца. І ў гэтым выпадку ўсім трэба разабрацца з колішнімі крыўдамі і проста навучыцца жыць побач. І мірыцца з усімі фізічнымі і псіхалагічнымі асаблівасцямі абодвух бакоў. Для прыкладу: менавіта ў Гомелі зусім нядаўна жыла жанчына, сёння прызнаная святой. Гаворка пра Манефу Скопічаву. Яна таксама не мела магчымасці рухацца, але ж змагла стаць неабходнай тым, хто меў здаровыя ногі.

Тым часам і жыццё Андрэя Антоненкі напаўнае не толькі вера ў хуткае ўсталяванне пад'ёмніка. Хлопец сам распрацоўвае сайты для сяброў. На працягу апошніх дзесяці гадоў ён займаецца камп'ютарнай графікай. Гаворыць, пасля паспяховага заканчэння школы яму прыйшлося спасцігаць усё самастойна:

— Я займаюся дызайнам, стварэннем сайтаў, мастацкай апрацоўкай фатаграфій у фоташопе, раблю эскізы для друку на адзежы, займаюся мантажом відэа, а цяпер асвойваю праграму па напісанні музыкі... Захапіўся паліграфіяй і тыпаграфікай. Малюю калажы і лагатыпы. Валодаю шматлікімі дызайнерскімі праграмамі. Ведаю тэхнічную англійскую мову.

Па словах Андрэя, ёсць шмат добрых бясплатных курсаў па рабоце з патрэбнымі



Так Андрэй цяпер вяртаецца дадому.

яму праграмамі ў інтэрнэце. Яны і дапамагаюць віртуальна выходзіць далёка за межы сваёй кватэры. Мара — урэшце зрабіць захапленне працай з пастаянным заробкам:

— Я спадзяюся, што хутка пачну выбірацца з дома самастойна, буду наведваць мерапрыемствы, хадзіць на сустрэчы групы актывістаў «Сёмы пялёстак», ды і проста часцей дыхаць свежым паветрам, мець стасункі з людзьмі. Для любога здаровага чалавека гэта штодзённасць, а для мяне стаць паўнапраўным членам грамадства — сапраўднае дасягненне. На працягу свайго жыцця я прывык змагацца і зразумеў, што, відаць, такое маё прызначэнне. Гэта ўвайшло ў звычку. Я настроены пазітыўна, але час пакажа, як усё будзе.

Словы падтрымкі малады чалавек чуе зноў жа дзякуючы шматлікім стасункам у інтэрнэце. Гаворыць, прыемна, што суцяшаюць нават з-за мяжы:

— З Аўстраліі былая суайчынніца напісала. Пастаянна пішуць з іншых гарадоў Беларусі і нават запрашаюць у госці. Мне здаецца, праблема сапраўднай інклюзіі сур'ёзная ў маштабе краіны. Я для сябе зразумеў, што ў гэтай сітуацыі ёсць нейкі сэнс, Боская воля. Важна, каб змяненні да лепшага былі не толькі ў маім жыцці, але ж і ў жыцці іншых людзей. Думаю, пасля гэтай сітуацыі знойдуцца людзі, якія вырашаць дамагацца ўсталявання пад'ёмніка і для сябе. Калі хаця б аднаму чалавеку дапаможа мая гісторыя, усё будзе не дарэмна.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# РАДАСЦІ ПЕНСІЯНЕРА...



## Як зрабіць жыццё пажылога сваяка больш цікавым?

Каб не даць чалавеку скаціцца ў «дажыванне» (а дэпрэсія пажылых — вельмі распаўсюджаная праблема, гэта вам скажа любы псіхатэрапеўт), трэба ўсімі спосабамі падтрымліваць іх цікавасць да жыцця. Лепш за ўсё гэта могуць зрабіць тыя, хто любіць іх — блізкія людзі. А адным з такіх спосабаў могуць стаць камп'ютар і сацыяльныя сеткі.

«Мая бабуля ў 71 год завяла сабе акаўнт на «УКантакце», — расказвае 21-гадовая студэнтка БДУ Крысціна Вашкевіч, якая працуе як валанцёр на розных мерапрыемствах. — Гэта проста выдатна, што цяпер ствараюцца праекты па камп'ютарнай адукаванасці пажылых людзей. Чалавеку нельга спыняцца ў сваім развіцці. Калі ў пажылога чалавека ёсць цікавы занятак, у яго знікае адчуванне, што яго дні праходзяць аднастайна і сумна і што яму нават няма чым падзяліцца са сваімі блізкімі, акрамя як скаргамі на жыццё. Ён перастае адчуваць сябе абузай».

**Давайце паглядзім праўдзе ў вочы — актыўнай з'яўляецца толькі малая частка пажылых беларусаў. Так, яны разбіваюць нашы стэрэатыпныя ўяўленні пра жыццё на пенсіі, але нам нікуды не дзецца ад таго факта, што значная колькасць людзей сталага ўзросту, на жаль, гэтым стэрэатыпам адпавядае.**

Вядома, мы не можам праводзіць увесь час са сваімі старымі — мы павінны працаваць, займацца хатнімі і іншымі справамі. Але можна пераламаць сітуацыю з іх адзінотай і адчуваннем бездапаможнасці, прычым для гэтага не патрабуецца нейкіх вялікіх ахвяр з нашага боку. Досыць невялікай увагі, праўда, падысці да справы трэба будзе творча.

Напрыклад, займаючыся пакупкамі, можна ўспомніць і пра сваю бабулю. Яна ж не можа, як мы, ездзіць па крамах і часцяком нават паняцця не мае, што бываюць розныя маленькія штучкі, якія робяць наша жыццё больш зручным і прыемным. Некаторыя тавары — са сталічнага або з інтэрнэт-магазіна, якія мы даўно ўспрымаем як рэчы самыя звычайныя, могуць стаць для яе цэлым адкрыццём.

«Я проста ашчаслівіла сваю бабулю, падарыўшы ёй пачак капеечных стыкераў (налепак), — расказвае Крысціна. — Яна любіць, каб ва ўсім быў парадак. Так, у яе ёсць агульны сшытак, у якім бабуля, паслухаўшы радыё або тэлевізар, піша рэцэпты і розныя нататкі — патрэбныя тэлефоны, парады доктара і іншыя. Я зрабіла ёй у сшытку «рубрыкі», і яна цяпер не перапісвае туды адно і тое ж па два разы з нейкіх лісточкаў, а піша свае нататкі на каляровых стыкерах, і потым уклейвае іх у адпаведную рубрыку. Так у бабулі атрымалася самая сапраўдная картатэка карысных звестак — і прытым вельмі яркая, каляровая! А яшчэ на стыкерах яна піша розныя запісачкі для сябе, каб чагосьці не забыць зрабіць, і расклейвае іх на бачных месцах — бо памяць ужо трохі стала падводзіць».

## Можа, калі-небудзь мемуары вашай бабулі патрапяць у газету...

Часта бывае, што пажылыя сваякі раз за разам расказваюць нам адны і тыя ж аповеды пра сваё дзяцінства і юнацтва, і слухаць іх, пагадзіцеся, бывае ўжо проста немагчыма, а не слухаць — чакай крыўды. Але ж гэтыя ўспаміны на самай справе — вельмі каштоўная рэч. Можна прапанаваць пажылому чалавеку запісаць свае мемуары. Паверце, потым, праз нейкі час, чытаць іх вы ці хтосьці іншы будзеце з захапленнем. Калі бабулі або дзядулі цяжка запісваць — напрыклад, падводзіць зрок ці проста яны лічаць, што не майстры пісаць — дапамажыце ім асвоіць дыктафон, гэтая функцыя зараз ёсць практычна ў любым тэлефоне. І хай пажылы чалавек надыктоўвае свае ўспаміны...

Усё жыццё нашых бацькоў і бабуль з дзядулямі часцяком было барацьбой за выжыванне — нярэдка яны працавалі на знос, каб зводзіць канцы з канцамі. А выйшаўшы на пенсію і атрымаўшы нечакана шмат вольнага часу, многія з іх не ведаюць, чым сябе заняць, ну, акрамя як клапаціцца аб дзецях і ўнуках. Але ў тых сваё жыццё, і бывае, што клопат з боку старых людзей становіцца проста навязлівым. А што, калі паспрабаваць знайсці ім захапленне? Адшукайце іх аднакласнікаў у інтэрнэце і дапамажыце пачаць перапісвацца з імі. Або запампуйце з YouTube іх любімыя рамансы ці песні маладосці і падарыце недарагі плэер — убачыце, якімі меламанамі яны стануць. І не застанецца месца пачуццю суму. Варта толькі крыху падумаць — і заўсёды можна прыйсці да нейкай цікавай ідэі, для рэалізацыі якой не трэба ні шмат грошай, ні процьмы часу...

**Святлана БУСЬКО.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*




## «МНЕ ГОЛАС БЫЎ...»

Мянушкі — трапныя, дасціпныя, хоць падчас і крыўдныя — бытуюць, відаць, у кожнай вёсцы. Нейкія з іх «прыліпаюць» да людзей з дзяцінства, нейкія — нажываюцца цягам жыцця. У прыватнасці, добразычліваму, вясёламу Антону Міхайлавічу (Антосіку, як называў яго ў маленстве бацька) яшчэ ў першых класах далі імя Пакацігарошак — напэўна, таму, што быў ён сярод дзяцей і самым ніжэйшым, і самым таўсцейшым. Потым, калі хлопец трохі падрос і патанеў, ён стаў проста Гарошкам, а калі да гэтага яшчэ і пасталеў, то ўжо і Гарохам.

Добрым ён чалавекам быў: хораша спяваў, граў на гармоніку, ведаў безліч прыпевак — і лірычных, і сатырычных, і сціплых, і так званых салёных... Па маладосці трактарыстам працаваў, потым — даглядчыкам бычкоў. А тады, вядома ж, не было сучасных комплексаў — скаціну на фермах трымалі папросту — у звычайных вялікіх хлявах, прычым досыць халодных. Не дзіва, што жывёлаводам хацелася часам пагрэцца. Чым? Ну вядома ж, бутэлечкай-другой «пладова-выгаднага» віна.

Дык вось, аднойчы, ужо глыбокай восенню, дзядзька Антось вызваўся «падсочыць» па «яго» ў мясцовую краму. Гэта кіламетры за тры ад фермы. «Але ж мой Буян, — пахваляўся Гарох, — як Канёк-Гарбунок — умомант дамчыць. Вы толькі закусь рыхтуйце».

...Пра далейшы ход падзей дзядзька расказваў сам — часам са скрухай, а найчасцей са смехам і з задавальненнем.

Значыць, даехаў ён да крамы і атаварыўся: купіў дзве бутэлькі віна. Адну з іх паклаў у воз, у салому, другую, каб трохі сагрэлася, засунуў сабе за пазуху. Потым борздзенька ўскочыў на воз і сапраўды мігам даехаў бы, але па дарозе расшпілілася папруга. «Трэба паправіць», — вырашыў «кіроўца», спыніў каня і скочыў з воза.

Разам з ім, як і варта было чакаць, на мерзлую зямлю «скочыла»... бутэлька, якую дзядзька трымаў за пазухай, і не ўцалела, на жаль, — разбілася, адпаведна — віно разлілося, праўда, не па «ўсёй зямлі»: добрая палова яго трапіла ў глыбакаваты «кубак» — ямку ад конскага капыта.

— Была б лыжка, пасёрбаў бы, — са смехам потым расказваў Гарох. — Была б якая трубачка, — высмактаў, быў бы хлеб — вымакаў... А так — ну не прападаць жа дабру — давялося стаць на калені і піць: як алень той — з калень...

Гэта дужа нязручна, скардзіўся Гарох. І гнуцца, маўляў, давялося, і нос замінаў, і калені балелі...

Так што круціўся ён і гэтак, і так...

А зверху нібы голас яшчэ: не пі з капытка, а то козлікам станеш...

Вось Гарох і кінуў гэты занятак — не дапіў віно, зашпіліў папругу, прыспешыў каня.

Але ж спазніўся ўсё роўна: сябрукі яго, даўно сабраўшы закуску, сем разоў знерваваліся. І таму, калі «экспедытар» нарэшце прыехаў ды сказаў, што адна з бутэлек разбілася, хлопцы не ўтрымаліся — абазвалі яго... І казлом таксама.

Праўда, было ўсё гэта пад гарачую руку, што называецца. Потым яны падабрэлі, павесялелі, нават віна налілі. Аднак Гарох рашуча адмовіўся, сказаў: «Не, браткі, я сваё выпіў... І нават вашага... Хоць мне і цяжка было».

**Альфрэд Тычко,**
*в. Ідолта, Мёрскі раён.*

## ПРАПАЛА... ЯК У ПРОЦЬМУ ЎПАЛА

Цётка Зося з цёткай Палашкай даўно на пенсіі, час маюць, а таму калі-нікалі сыдуцца разам ды ўспамінаюць сваё мінулае. На ферме, расказваюць, працаваць было цяжка. У кожнай даяркі па 25, а то і па 30 кароў... Пакармі іх, падаі, стойлы пачысці — усё ўручную! Але ж мы тады маладыя былі, трывушчыя: не стамляліся, на жыццё не наракалі, не крыўдавалі.

Хоць, калі паслухаць гэтых жанчын, дык павінны былі. Ва ўсякім разе — на мой погляд.

...У той год, як расказвалі даяркі, зіма расцягнуся, як у гэты. Не дзіва, што кармоў не хапала: і калгас жабраваў па суседніх гаспадарках, і калгаснікі — хто дзе мог.

Гэтыя жанчыны, ну вядома ж, «маглі» на ферме.

Неяк, значыць, управіліся яны, кінулі вочкамі па баках — ці не трэцца тут хто чужы, падхапілі цюкі (раней яны невялічкія былі, не тое што цяпер) і падаліся з кароўніка. Хуценька ішлі, але ж нядоўга: толькі завярнулі за рог, як бачаць — з дарогі і проста на іх нясецца машына.

— Мусіць, з праверкай? Сам старшыня?! — спалохалася Зося.

— Уліплі! — падхапіла Палашка і па цемры, не разбіраючы, што пад нагамі, збочыла са сцежкі.

Зоська далася следам.

У страха, як той казаў, вочы па яблыку: колькі метраў і ў які бок прабеглі, жанчыны не ведалі, але ж хутка адчулі, што ногі нібы ў багне якой — пачынаюць гразнуць, прычым з кожным крокам глыбей...

— Дык гэта ж, мусіць, адстойнік? — з жахам прашаптала Зося.

Але паварочваць назад ужо не выпадала. Каб не выдаць сябе лішнім гукам, жанчыны стаялі там, дзе стаялі.

Начальства між тым пад'ехала да фермы і хутка ад'язджаць не збіралася. Час ішоў. Даярак, апроч страху, стаў даймаць холад...

Але ж вось, здаецца, залапатаў рухавік, засвяціліся яго фары і пры павароце ўсё святло сваё скіравалі ў... бок жанчын. Тыя, бедныя, ледзь паспелі паздзіраць з галоў свае светлыя хусткі ды прыгнуцца...

На «бераг», на сухое сталі выбірацца толькі тады, калі адчулі, што пранесла, што можна ўжо.

Ногі выцягваць вельмі цяжка было, абутак заставаўся ў жыжы, сена — таксама.

— І калгасных кароў недакармілі, і сваім не перапала, — шкадавалі даяркі.

...Што здзіўляе, яны і сёння ўспамінаюць гэту прыгоду з рогатам, шкадуюць не сябе, не сваю гаротную маладосць, што прапала — як у процьму ўпала, а тых недакормленых каровак і сена.

**Галіна Нічыпаровіч,**
*в. Магільна, Уздзенскі раён.*

## ЮРКАВЫ ПРЫСМАКІ,

### альбо Хто ў хаце гаспадыня?

Не без таго: многія з нас часам думаюць, што ў іншых людзей — суседзяў, знаёмых, калег, сяброў — усё лепшае: праца, жытло, мэбля, машына, а ўжо дзеці, жонкі-мужы, бацькі...

Аднак вось тут, у сямейных адносінах, лепш увогуле не меркаваць, бо, як казаў нехта з разумных, часам рэчы зусім не такія, як здаюцца на першы погляд. Пацвярджэннем таму наступная гісторыя.

...Пятроўне, нашай галоўнай бухгалтарцы, употай зайздросцілі ці не ўсе жанчыны.

— Ёй добра, — захапляліся адны, — не трэба пасля працы дамоў спяшацца. Там і без яе ўсё пароблена...

— Гэта ж як пашанцавала: муж сам на кухні завіхаецца, — здзіўляліся другія, — яе да пліты ні на крок не падпускае.

— А як гатуе...

У тым, што муж бухгалтаркі выдатны кулінар, мы пераконваліся пастаянна: падчас абедзеннага перапынку Пятроўна частавала нас то хатнім печывам, то блінчыкамі з рознымі начынкамі, то адмыслова засоленай паляндвіцай... І пры гэтым заўсёды гаварыла: «Пакаштуйце, дзяўчаты, што мой Юрка прыгатаваў. Пальчыкі абліжаце!»

І мы сапраўды аблізвалі. А тым больш калі віншавалі Пятроўну з днём нараджэння і потым чаявалі з тортам, які спёк для жонкі любімы кулінар.

Яго, дарэчы, мы ведалі і асабіста, бо ён, прабягаючы міма нашай установы, часцяком зазіраў да жонкі ў кабінет, каб паказаць — пахваліцца зробленымі пакупкамі ці, наадварот, даручыць «палавіне»:

— Будзеш ісці дадому, не забудзься хлеба купіць, чуеш?

— Чую, — адказвала Пятроўна.

І па тым, як жа цяжанька ўздыхала, можна было здагадацца, што дома ў яе не ўсё так проста...

Аднойчы, напрыклад, бухгалтарка, заўсёды вясёлая ды гаваркая, ледзь не паўдня зацята маўчала.

— У вас нешта зрабілася? — далікатна спытала я, бо мы (кабінеты побач) зрэдку дзяліліся набалелым.

— Зрабілася?.. Сорам сказаць, — прызналася Пятроўна. — Узялася на балконе парадак навесці і, у яго не спытаўшы, вазон адзін выкінула. У ім засохлая кветка была... Дык мой з-за яе такую калатнечу ўзняў — аж вокны ў хаце дрыжэлі.

Гэта быў пачатак маналогу. А ў канцы...

— Каб хто толькі ведаў, як жа цяжка з такім чалавекам жыць! — усклікнула жанчына. — Мяне ж ён за гаспадыню не лічыць!..

...Чым я магла дапамагчы Пятроўне?

Толькі тым, што цярпліва выслухала яе, бо што параіш немаладой жанчыне, якая і без мяне цудоўна ведае, што сямейнае жыццё — гэта суцэльны кампраміс.

**Ірына Матусевіч,**
*Дзяржынскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

## УКРАДЗЕНАГА САБАКУ ДВОЙЧЫ ПАДАРЫЛІ

**Гэтая гісторыя скончылася добра для сабакі. А вось пачаткам яе стала глупства аднаго брастаўчаніна, які ў кампаніі сяброў ехаў па вуліцы пасёлка Мухавец.**

Там ён заўважыў мопса, што выбег з веснічак дома, і забраў яго ў салон машыны. Як расказаў **намеснік начальніка Брэсцкага РАУС Ігар ТРАЦЮК**, у міліцыю звярнуўся ўласнік сабакі з заявай аб крадзяжы свайго чатырохногага сябра. Мужчына расказаў, што дамашні любімец выскачыў з веснічак, тут яго падхапілі ў невядомую машыну і звезлі. Але ў ходзе аператыўна-пошукавых мерапрыемстваў міліцыянеры знайшлі сабаку. Яго выкрадальнік потым расказаў, што мопса ён падарыў сябру. Той адразу абрадаваўся, а потым спахапіўся, што сабаку трэба карміць, даглядаць, акрамя таго, мопс пачаў моцна скуголіць, відаць, сумаваў па сваім доме і гаспадару. І новы ўладальнік не знайшоў нічога лепшага, як хуценька перадарыць жывёліну прыяцелю. Апошні аказаўся аматарам сабак, стаў клапаціцца пра мопса. І вельмі здзівіўся, калі да яго прыйшлі міліцыянеры... А небарака-злодзей так і не змог растлумачыць, навошта ён украў сабаку. 23-гадовы непрацуючы брастаўчанін толькі мармытаў нешта накшталт: «Не ведаю, што на мяне найшло...» Але ж ад крымінальнай адказнасці гэтыя тлумачэнні яго не вызваляюць.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**ЛОТ 1:** капитальное строение, инв. № 441/С-13748 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина «Молодежный»), обшей площадью 190,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Ивье, ул. Молодежная, 8Г

Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым № 422950100001002376, площадью 0,0283 га (назначение – земельный участок для обслуживания магазина), расположенном по адресу: г. Ивье, ул. Молодежная, 8Г

Начальная цена продажи – 62 880 руб. (шестьдесят две тысячи восемьсот восемьдесят рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 3 144 руб. (три тысячи сто сорок четыре рубля)

Продавец – Ивьевский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231337, Гродненская область, г. Ивье, ул. Энгельса, 5, тел.: 2-11-67, факс 2-23-95

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38

Условия аукциона:
1. Расходы по государственной регистрации договора купли-продажи, перехода права собственности возложить на Покупателя.
2. Право собственности переходит к Покупателю после передачи объекта и государственной регистрации данного права в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».
3. Документом, подтверждающим передачу имущества, является акт приема-передачи.
Але бывае і наадварот — з'яўляецца раптам у тваім жыцці нехта, каго ты яшчэ ўчора зусім не ведаў, але менавіта ён у адзін момант вяртае табе веру ў людзей увогуле і ў кожнага асобна. Я не буду нават спрабаваць перадаць тую роспач і адчуванне незваротнасці, калі, вярнуўшыся з горада дадому, убачыла, што з сумкі знік тэлефон, на якім былі запісы голасу і відэа самага дарагога ў жыцці чалавека, якога ўжо няма і ніколі не будзе побач. Тэлефон быў стары, наўрад ці хтосьці паквапіўся на яго, калі тут жа ляжаў сучасны смартфон. Значыць, згубіла. І знайсці яго ў двухмільённым горадзе — амаль без шанцаў.

Ведаеце, я яго знайшла. Дзякуючы Рэжысёру нашых жыццяў, які дапамог зразумець і адчуць, што з усіх перамяшчэнняў таго дня шукаць трэба менавіта ў аўтобусе, на якім вярталася дадому. А яшчэ дзякуючы зусім незнаёмым людзям — дыспетчару пятага сталічнага аўтапарка, якая, лічы, сярод ночы знайшла кіроўцу таго аўтобуса, і самому кіроўцу, які, уже на той час прыехаўшы ў парк, уважліва агледзеў салон і знайшоў прапажу на падлозе пад сядзеннем. Я хацела тут жа імчацца забіраць дарагую мне рэч, але ён, даведаўшыся, што збіраюся ехаць на таксі, адгаварыў і назаўтра раніцай, у свой выхадны, па дарозе на лецішча прывёз мне яго дадому. Ад матэрыяльнай падзякі катэгарычна адмовіўся, я не паспела нават як след падзякаваць яму на словах — ён хуценька, бы ўцякаючы і саромеючыся, сеў у машыну і з'ехаў з двара...

Я менавіта так гэтыя дзве падобныя і непадобныя гісторыі задумала напісаць, а пасля паразважаць пра нас, чалавекаў, пра тое, чаго мы адно перад адным і перад самімі сабой вартыя. Асабліва ў такіх, калі здараецца самае непапраўнае. Але яшчэ адна гісторыя, якую пачула раніцай перад тым, як сесці за камп'ютар, унесла ў задумку карэктывы: сітуацыя, якая яна ні была б, тут абсалютна ні пры чым.

У Дзень Перамогі пляменніца з мужам і малымі дзецьмі вымушаны былі вяртацца з вёскі, дзе жыве свякроў, у сталіцу на грамадскім транспарце — зламалася машына. Паспявалі на апошні вячэрні аўтобус, што ходзіць па выхадных. Вёска Волма (тая самая, дзе старая сядзіба Ваньковічаў захавалася) у гэтага аўтобуса канцавы прыпынак. Але ісці да разваротнага кальца ў цэнтры з малымі далёка — кіламетра паўтара, і ўвесь час пад гару, тым больш на павароце недалёка ад хаты абсталяваны прыпыначны пункт — з пляцоўкай і сметніцай, як паложана. Туды і пакіравалі нашы маладыя — двухгадовая Верка ў калясцы, чатырохгадовы Максім з мамай за руку... Аўтобус, выехаўшы з-за павароту, нават не прытармазіўшы каля таго прыпынку, дзе яны стаялі, прамчаўся міма. Яны махалі, крычалі — без выніку. Больш за тое, у салоне ехала іхняя сяброўка, якая таксама крычала, барабаніла ў кабіну кіроўцы. Той, не звяртаючы ўвагі, цісну на газ, і толькі спыніўшыся на наступным прыпынку кіламетры праз два (на якім не было ніводнага чалавека), не адчуваючы акцэнта ў кабіне, па гучнай сувязі абвясціў, што там, дзе ён пакінуў позна ўвечары сям'ю з малымі дзецьмі, у яго маршруце «прыпынак не прадугледжаны»...

Я не ведаю, дый ведаць не хачу, як завуць гэтага «правільнага» кіроўцу. Але я ведаю, што згублены тэлефон мне дадому прывёз Мікалай Хмелінко, і ў яго не было ніякай службовай інструкцыі, якая абавязвала б яго гэта рабіць. І гэта з усяго вышэйнапісанага — самае галоўнае.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ**

■

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.14 | 20.59 | 15.45 |
| Віцебск — | 4.58 | 20.54 | 15.56 |
| Магілёў — | 5.04 | 20.49 | 15.45 |
| Гомель — | 5.08 | 20.39 | 15.31 |
| Гродна — | 5.31 | 21.13 | 15.42 |
| Брэст — | 5.38 | 21.07 | 15.29 |

## Месяц

*Апошняя квадра 8 мая. Месяц у сузор'і Авена.*

## Імяніны

*Пр. Ганны, Жанны, Марыі, Яны, Аўсея, Віталя, Кірылы, Максіма. К. Міры, Ігната, Кірылы, Францішка, Якуба.*



Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

# ЗАЎТРА




## Даты | Падзеі | Людзі

**11 МАЯ**




**1765** год — у Гродне заснавана музычная капэла — прыдворны аркестр А. Тызенгаўза. Капэла лічылася найлепшым прафесійным калектывам у ВКЛ, была вядомая за яго межамі, у тым ліку ў Германіі. У 1780 годзе была ангажаваная ў Нацыянальны тэатр у Варшаве. У капэле былі замежныя і мясцовыя музыканты, у тым ліку прыгонныя, якія навучаліся ў Гродзенскай музычна-тэатральнай школе А. Тызенгаўза. Рэпертуар капэлы ўключаў араторыі, месы, сімфоніі, бытавую музыку.

**1778** год — нарадзіўся (маёнтак Пацейкі Навагрудскага павета) Міхаіл Мікалаевіч Ачапоўскі, вучоны-аграном, глебазнавец. У 1819—1822 гадах падарожнічаў па Заходняй Еўропе і вывучаў сістэмы гаспадарання ў Англіі, Галандыі, Германіі, Францыі, Швейцарыі. Пасля вяртання з-за мяжы быў прызначаны прафесарам сельскай гаспадаркі ў Віленскі ўніверсітэт. У 1828-м — інспектар школ у Вільні. Член навуковага камітэта пры Міністэрстве дзяржаўнай маёмасці ў Пецярбургу, прамысловага савета, савета народнай асветы, навуковага таварыства пры Горы-Горацкім земляробчым інстытуце. Аўтар шэрагу навуковых прац. Памёр у 1854 годзе.

**1935** год — быў адкрыты Мазырскі калгасна-саўгасны тэатр. Створаны з удзельнікаў мастацкай самадзейнасці. З 1937 года мастацкім кіраўніком быў В. Пацехін. У рэпертуары пастаноўкі: «У веснавую ноч» Е. Міровіча, «Партызаны» К. Крапівы, «Не было ні граша, ды раптам шастак» А. Астроўскага, «Каварства і каханне» Ф. Шылера і інш. У 1938 годзе быў рэарганізаваны ў Палескі абласны драматычны тэатр.




**1721** год — Камер-калегія ў Расіі выдала ўказ, які прадпісваў жаць хлеб не сярпамі, а косамі з граблямі (як у Прыбалтыцы, каб скараціць страты пры ўборцы).

**1858** год — нарадзіўся Карл Гаўптман, нямецкі пісьменнік, паэт, драматург. Аўтар драм «Арфа караля», «Напалеон Банапарт», раманаў «Мацільда», «Эйнгарт-насмешнік» і іншых. Памёр у 1921 годзе.

**1910** год — быў спушчаны на ваду крэйсер першага рангу Балтыйскага флота «Аўрора». Закладзены карабель быў 23 мая 1897 года. У 1948-м пастаўлены на вечную стаянку ля Петраградскай набярэжнай.

**1939** год — пачаўся ўзброены канфлікт на рацэ Халхін-Гол, які ў Японіі называюць «Наманханскім інцыдэнтам», — гэта баявыя дзеянні паміж СССР і Японіяй у 1939 годзе на тэрыторыі Манголіі недалёка ад мяжы з Маньчжурыяй. Яшчэ ў 1932 годзе Японія, акупіраваўшы Маньчжурыю і Унутраную Манголію, стварыла там дзяржаву Маньчжоу-Го, якую СССР разглядаў, як адзін з плацдармаў для будучага ўварвання ў савецкае Прымор'е і Усходнюю Сібір. Улічваючы напружанасць становішча, урады СССР і МНР у 1936 годзе падпісалі Пратакол аб узаемнай дапамозе, які змяшчаў абавязацельства СССР «абараняць мангольскія межы як свае ўласныя». Пасля жорсткіх баёў Квантунская армія да 31 жніўня была разгромлена, а тэрыторыя Мангольскай Рэспублікі ачышчана ад войскаў праціўніка. Страты з абодвух бакоў вылічаліся дзясяткамі тысяч забітых і параненых.



## УСМІХНЕМСЯ

**Вяду машыну, побач жонка:**

**— Вазьмі левы рад. Вярніся ў правы. Навошта ты пасярэдзіне едзеш?.. Тут паварні, будзе карацей. На гэтай вуліцы не трэба — шмат святлафораў...**

**Міма праехаў мужык, адзін у машыне. І як ён ведае куды ехаць?..**

— Васіль, хочаш, я падару табе на дзень нараджэння партманет? Ці зацісак для грошай?

— Зацісак для грошай у мяне ўжо ёсць, гэта мая жонка.

**Амаль любы від спорту становіцца лепшы.**

**...Калі ён пляжны і жаночы.**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1792.

Нумар падпісаны ў 19.30 10 мая 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

11 мая 2018 г. № 19 (452)




стар. 3

**Не арандуюць, не купляюць...**



стар. 14

**Прыватная ініцыятыва вітаецца**



стар. 16

**Пляжы да сезона гатовыя?**

ТЭМА ТЫДНЯ

# ПРАЗ ВАЕННЫ ГАРАДОК...



Месца для адпачынку ў в. Заслонава.

**ЛЕПЕЛЬСКІ раён спецыфічны. У Віцебскай вобласці ён, напэўна, самы ваенізаваны. У розныя часы тут размяшчаліся ракетная брыгада, артылерыйская база і штаб танкавай дывізіі. Усё гэта былі закрытыя аб'екты, адпаведна, абмяжоўваўся і доступ да ваенных гарадкоў, дзе жылі ваеннаслужачыя з сем'ямі. Аднак з часам асабовы склад пачаў скарачацца, меры аховы сталі не такія жорсткія.**

## «Харошы народ»

Заслонава — адзін з такіх былых «ваенных гарадкоў». Ледзь трапіш у вёску, адразу кідаюцца ў вочы мясцовыя кантрасты. Побач з напаўразбураным жылым будынкам без вокнаў і дзвярэй — адрамантаваны шматпавярховік, на якім, здаецца, яшчэ не высахла фарба. Новыя заасфальтаваныя дарожкі — і чорная зямля, дзе пакуль не паспеў вырасці газон... Дарэчы, навядзеннем парадку якраз займаліся найбольш актыўныя жыхары вёскі. Быў разам з імі і **старшыня Горскага сельскага Савета Васіль БАДЗЯЙ.**

— Вясною асноўныя намаганні скіроўваем на добраўпарадкаванне. Цяпер самая пара прыбіраць смецце, спілоўваць аварыйныя дрэвы. Патрабуюць увагі могілкі. Фінансаванне атрымліваем з абласнога і раённага бюджэтаў. Дадаткова існуе самаабкладанне жыхароў, хоць гэта практыка пакуль не вельмі пашырана. Мы разлічваем, што сабраныя жыхарамі пэўнага дома грошы будуць выкарыстаны, каб паставіць побач з пад'ездам лаўку, пафарбаваць сцены, выканаць дробны рамонт.

З падобнай практыкі можа атрымацца сэнс, бо **дэпутат Горскага сельскага Савета Людміла БЫХАВЕЦ** заўважае: «Народ тут харошы». Ледзь прыйшло цяпло, жыхары па ўласнай ініцыятыве прыбралі клумбы, пафарбавалі дэкаратыўныя элементы, ачысцілі двары ад смецця... Што цікава, частка жыльцоў шматкватэрных дамоў адмовілася ад паслуг уборкі ў пад'ездзе, размеркаваўшы гэту работу паміж сабой. Лесвічныя пралёты ўпрыгожаны палавічкамі, вазонамі з кветкамі, мяккімі цацкамі і нават... карцінамі.

стар. 4

НАПЯРЭДАДНІ

# МАГІЛЁЎ НАВОДЗІЦЬ ГЛЯНЕЦ

### Абласны цэнтр працягвае рыхтавацца да V Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі

**Мерапрыемства такога ўзроўню — справа адказная. Да канца верасня, на які прызначана яго правядзенне, горад павінен адчувальна папрыгажэць. Будуецца парадная лесвіца з фантанамі, па якой можна будзе спусціцца ў Падмікольскі парк. На ўездзе ў Магілёў з боку Мінска амаль гатова трыумфальная арка. Рыхтуюцца пляцоўкі для прыёму высокіх гасцей, але канчатковы варыянт, дзе што будзе адбывацца, пакуль не агучваецца. У Магілёўскім аблвыканкаме паказалі праект праграмы форуму на канец сакавіка. Адразу ж звярнула ўвагу на тое, што ў параўнанні са студзеньскім варыянтам (калі «МС» ужо звярталася да гэтай тэмы) ёсць змены. І, як папярэджваюць арганізатары на месцах, яны могуць быць не апошнія.**

## Вялікая будоўля

Работа кіпіць на шматлікіх пляцоўках, якія плануецца задзейнічаць у рабоце форуму.

Для падвядзення яго вынікаў і правядзення пленарнага пасяджэння з удзелам старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіла Мясніковіча і старшыні Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі Валянціны Матвіенкі разглядаецца пляцоўка Палаца культуры вобласці. Зараз там вядзецца маштабная рэканструкцыя. Плануецца замяніць дах, зрабіць капрамонт канцэртнай залы і ўстанавіць сучаснае абсталяванне. Абяцаюць, што ўнікальная акустыка залы, якая ўмацоўваецца з дапамогай спецыяльных трубак у сценах, захаваецца. (Артысты заўсёды адзначаюць, наколькі якасны тут гук.)

Наводзіць глянец гістарычная вуліца Ленінская — Вялікая Садовая: плануецца асвяжыць фасады яе дамоў, добраўпарадкаваць прылеглыя да іх тэрыторыі. Вядуцца работы па добраўпарадкаванні парка Падмікольле з будаўніцтвам веласіпедных і пешаходных дарожак, зон адпачынку. На капрамонце знаходзіцца галоўная плошча — Славы, дзе будуць абноўлены стэла і барэльефы, а саму плошчу вымасцяць гранітнай пліткай.

стар. 2



Мікалай МІХАЛЕНЯ: у «Магілёўліфтмаша» з Расіяй цеснае супрацоўніцтва.

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## Прыярытэт знешняй палітыкі

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ правёў прэс-канферэнцыю для прадстаўнікоў цэнтральных і рэгіянальных сродкаў масавай інфармацыі Кітайскай Народнай Рэспублікі, якія прыехалі ў нашу краіну ў прэс-тур.**



Прэс-канферэнцыя доўжылася дзве з паловай гадзіны. Прагучала больш за 20 пытанняў, якія закранулі розныя сферы супрацоўніцтва Беларусі і Кітая — палітычную, гандлёва-эканамічную, інвестыцыйную, навукова-тэхнічную, гуманітарную.

«Беларусь даражыць адкрытымі і сяброўскімі адносінамі з Кітайскай Народнай Рэспублікай, — сказаў Міхаіл Мясніковіч. — Развіццё супрацоўніцтва з Кітаем — ключавы прыярытэт знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь. Наша краіна разглядае Кітай у якасці надзейнага сябра і стратэгічнага партнёра».

Міхаіл Мясніковіч падкрэсліў, што ў аснове беларуска-кітайскага партнёрства — шчырая дружба і высокі давер паміж кіраўнікамі дзвюх дзяржаў Аляксандрам Лукашэнкам і Сі Цзіньпінам.

Высокі ўзровень палітычнага дыялогу садзейнічае ўмацаванню гандлёва-эканамічных сувязяў. Гэта пацвярджае статыстыка развіцця ўзаемнага гандлю. За апошнія сем гадоў тавараабарот тут вырас на 40 % — да 3,2 мільярда долараў у 2017 годзе. У сучасны момант Беларусь і Кітай рэалізуюць шматмільённыя інвестыцыйныя праекты.

## Беларусь турыстычная

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ірына СТАРАВОЙТАВА правяла пашыранае пасяджэнне секцыі Навукова-кансультатыўнага савета па пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі, прысвечаную развіццю турызму ў краіне.**

У пасяджэнні ўдзельнічалі прадстаўнікі міністэрстваў спорту і турызму, адукацыі, аховы здароўя, устаноў адукацыі, турыстычных арганізацый, грамадскіх аб'яднанняў.

Турызм мае вялікае значэнне для развіцця эканомікі, лічыць парламентарый. Ён генерыруе даход насельніцтва і прадпрыемстваў, забяспечвае рост падатковых паступленняў у бюджэты розных узроўняў, прыцягвае інвестыцыі, стварае новыя працоўныя месцы, павышае ўнутранае спажыванне і стварае попыт на мясцовыя тавары і паслугі.

Цяпер грамадскія адносіны ў гэтай сферы рэгулююцца шэрагам заканадаўчых актаў, пастаноў урада і асобнымі нормамі заканадаўства ў іншых сферах (мытнай, падатковай, зямельнай). Акрамя таго, існуе некалькі дзяржаўных праграм, якія прадугледжваюць стварэнне сучаснай інфраструктуры турызму ў розных рэгіёнах краіны.

Удзельнікі пасяджэння абмяркавалі асаблівасці турыстычных магчымасцяў беларускай сталіцы, пытанні падрыхтоўкі спецыялістаў у гэтай галіне, сучасныя падыходы да арганізацыі ўнутранага маладзёжнага турызму, перспектывы развіцця новых відаў вандровак, а таксама шэраг ініцыятыў, закліканых садзейнічаць больш эфектыўнаму выкарыстанню турыстычнага патэнцыялу краіны.

## Разам з дзецьмі

**Супрацоўнікі Сакратарыята Савета Рэспублікі ўзялі ўдзел у акцыі «Чысты вадаём», падчас якой разам з членамі Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў і вучнямі Сёмкаўскай сярэдняй школы Мінскага раёна прыбралі берагавую лінію Сёмкаўскага канала.**



Акцыя ладзіцца Беларускім таварыствам паляўнічых і рыбаловаў чацвёрты год запар. Сёлета, акрамя прадстаўнікоў верхняй палаты парламента, у ёй бралі ўдзел работнікі міністэрстваў унутраных спраў, па надзвычайных сітуацыях, прыродных рэсурсаў і навакольнага асяроддзя, Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Следчага камітэта, БРСМ і іншых арганізацый і ведамстваў. Усяго ў экафлэшмобе ўдзельнічала каля шасці тысяч чалавек. Агульнымі намаганнямі наведзены парадак больш чым на тысячы кіламетраў берагавой лініі вадаёмаў, рэк і каналаў.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# МАГІЛЁЎ НАВОДЗІЦЬ ГЛЯНЕЦ

## Лічбавая эканоміка

Плануецца, што адно з секцыйных пасяджэнняў адбудзецца менавіта на «Магілёўліфтмашы». Падрыхтоўка да форуму тут ідзе поўным ходам. Асфальтуюцца дарогі, добраўпарадкуюцца зялёныя зоны, рамантуюцца памяшканні. «Плануецца, што ў рабоце секцыі «Лічбавая эканоміка: перспектывы і развіццё» прыме ўдзел каля 60 чалавек, — удакладняе **намеснік генеральнага дырэктара «Магілёўліфтмаша» Мікалай МІХАЛЕНЯ.** — Напрыканцы красавіка прысутнічаў на пасяджэнні ў Савеце Рэспублікі, дзе на чале з сенатарам Уладзімірам Панцюховым абмяркоўваўся працэс падрыхтоўкі прадпрыемства да форуму. Ужо да ліпеня неабходна цалкам падрыхтавацца.

Мікалай Міхаленя праводзіць невялічкую экскурсію па тых месцах, якія збіраюцца паказаць удзельнікам форуму. Завяршаецца рэканструкцыя залы пасяджэнняў. Яшчэ нядаўна яна нагадвала пра савецкі перыяд, а зараз гэта цалкам сучаснае памяшканне. Сцены, вокны, столь — ужо атрымалі новае аблічча. Засталося зрабіць падлогу, прыбраць смецце і паставіць сучаснае абсталяванне. Праз тыдзень можна будзе пачаць яго мантаж, а потым плануецца непасрэдна заняцца сталовай.

Намеснік генеральнага дырэктара звяртае ўвагу на пакуль пустуючую агароджаную пляцоўку за акном. Там будзе ўстаноўлена шмат'ярусная паркоўка ў шэсць паверхаў. Такія паркоўкі асабліва выгадныя для гандлёвых цэнтраў, вакол якіх не хапае месцаў для машын. Кліенту выдаецца чып, ён заганяе транспарт унутр, вароты зачыняюцца і машына падымаецца на любы паверх. Распрацоўка ўнікальная, такога ў краіне яшчэ няма.



Гістарычная вуліца Ленінская стане яшчэ больш прыгожай.

— Падчас работы секцыі плануецца падпісанне кантрактаў як паміж краінамі, так і, магчыма, паміж нашым прадпрыемствам і расійскімі прадстаўнікамі, — кажа Мікалай Міхаленя. — У нас ёсць новая прадукцыя — ліфты без машыннага аддзялення, траваляторы — пасажырскія канвееры і шмат чаго не менш цікавага. Тэрмін эксплуатацыі нашага ліфта — 25 гадоў, гарантыя — два гады. Цяпер стаіць задача падоўжыць гэтыя тэрміны да 30 і 5 гадоў адпаведна.

«Магілёўліфтмаш» — прадпрыемства адносна маладое, 52 гады таму было пабудавана ў прамым сэнсе слова ў чыстым полі. Зараз яно дынамічна развіваецца і радуе сваімі поспехамі.



Уладзімір ЯСЕЎ са студэнткамі абмяркоўвае тэмы да будучага форуму.

## Традыцыі і навацыі

Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. Куляшова, дзе плануецца работа яшчэ адной секцыі, адна з найстарэйшых вышэйшых навучальных устаноў краіны — сёлета ён адзначае 105 гадоў з моманту свайго заснавання.

— Наш універсітэт адзін з найважнейшых культурна-адукацыйных цэнтраў, які рыхтуе спецыялістаў для сацыяльнай сферы — педагогаў, эканамістаў, юрыстаў, — кажа **прарэктар па вучэбнай рабоце Уладзімір ЯСЕЎ.** — У нас заключана больш як 40 дагавораў з вышэйшымі навучальнымі ўстановамі розных краін, у тым ліку Расіяй. Магілёўская вобласць мяжуе з расійскімі рэгіёнамі, і мы актыўна супрацоўнічаем са смаленскімі і бранскімі партнёрамі, удзельнічаем у сумесных мерапрыемствах, абменьваемся вопытам.



У музеі МДУ імя А. Куляшова.

Навукоўцы, выкладчыкі, студэнцкі актыў гатовыя да таго, каб абмеркаваць з расійскімі калегамі агульныя тэмы і праблемы. І вельмі спадзяюцца не толькі замацаваць старыя кантакты, але і завязаць новыя, выйсці на больш высокі ўзровень міжнародных стасункаў.

Да форуму плануецца цалкам абнавіць універсітэцкі музей. «Новая канцэпцыя ўжо ўзгоднена, засталося яе рэалізаваць, — кажа прарэктар. — Збіраемся адлюстраваць гісторыю наогул усёй сістэмы адукацыі ў Магілёўскім рэгіёне».

Будзе таксама абноўлена і дапоўнена фотагалерэя з ліку найлепшых выкладчыкаў, студэнтаў і аспірантаў, якую можна пабачыць па дарозе да канферэнц-залы, дзе плануюць правесці пасяджэнне.

## Музей еўрапейскага ўзроўню

Музей В. Бялыніцкага-Бірулі, дзе пакуль працягваецца рэканструкцыя, адзін з тых аб'ектаў, які абавязкова наведаюць высокія госці. Будаўнічыя работы тут амаль скончаны, наперадзе музеефікацыя аб'екта.

— Ужо распрацаваны і зацверджаны дызайн музейных памяшканняў, — паведаміла **загадчыца музея Святлана СТРОГІНА.** — Збіраемся напоўніць унутраную прастору той прыгажосцю, якая павінна быць у музеі такога тыпу. Пасля рэканструкцыі ён зможа прымаць выставы еўрапейскага ўзроўню. Тут устаноўлена сучаснае абсталяванне, якое забяспечвае ў памяшканнях неабходны музейны клімат-кантроль. Падчас работы форуму ў яго сценах адкрыецца выстава «Скарбы жывапісу» з фондаў Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі і Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі. Гэта мастацкія творы блізкіх сяброў Бялыніцкага-Бірулі — Ісака Левітана, Мікалая Багданава-Бельскага, Аляксандра Маравава, Станіслава Жукоўскага, Ігара Грабара, Аляксея Маторына, Аляксея Сцяпанава і іншых.

Трэці паверх стане шыкоўнай пляцоўкай для музейных занятак, лекцый, розных сімпозіумаў. Апаратура, якая будзе тут устаноўлена, дазволіць праводзіць анлайн-канферэнцыі на самым высокім узроўні.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й «МС».)*

ПРАБЛЕМЫ І РАШЭННІ

# Чыя «нічыйная» маёмасць?

**Да 2007 года працэс прыцягнення ў гаспадарчы абарот маёмасці, якая неэфектыўна або наогул не выкарыстоўвалася, быў несістэмным і хаатычным. Але з цягам часу сітуацыя пачала мяняцца да лепшага. Калі раней такая маёмасць прадавалася доўга і з вялікай асцярогай, то цяпер падыходы мяняюцца.**

Але гэтаму кірунку па-ранейшаму трэба ўдзяляць вялікую ўвагу, адзначалася днямі на пасяджэнні Мінаблвыканкама. Многія аб'екты знаходзяцца ў непрывабным, нездавальняючым, паўразбураным стане, тэрыторыя вакол іх зарасла хмызняком і пустазеллем. Не заўсёды яны агароджаныя, не на ўсіх уладкаваны папераджальныя таблічкі. Такія безгаспадарныя будынкі як магніт прыцягваюць дзяцей. Нягледзячы на забарону дарослых, яны ладзяць тут свае гульні і забавы, што можа закончыцца трагедыяй. Акрамя таго, што «нічыйныя» будынкі псуюць эстэтыку гарадоў і іншых населеных пунктаў, яны яшчэ патрабуюць дадатковых расходаў на ўтрыманне. А колькі новых вытворчасцяў і рабочых месцаў мы не далічваемся!

— Гэта адзін з найважнейшых кірункаў, якому неабходна ўдзяляць значную ўвагу. Ад эфектыўнасці нашай работы цалкам залежыць выкананне даручэнняў кіраўніка дзяржавы і ўрада па навядзенні парадку на зямлі, што асабліва актуальна ў Год малой радзімы, — падкрэсліў **старшыня Мінаблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА.**

У цэнтральным рэгіёне не выкарыстоўваецца практычна 3 тысячы аб'ектаў усіх формаў уласнасці, у тым ліку 418 аб'ектаў камунальнага падпарадкавання. Пытанні прыцягнення ў гаспадарчы абарот маёмасці разглядаюцца штогод. Але, на жаль, прыкметнага прагрэсу не назіраецца: паказчыкі не выконваюцца. У 2017-м, напрыклад, план па прыцягненні ў гаспадарчы абарот, зносе і кансервацыі аб'ектаў усіх формаў уласнасці быў выкананы толькі на 42 %, камунальнай — на 78,6 %. Паказчыкі па раёнах адрозніваюцца: дзесьці лепш, дзесьці горш, а недзе — і зусім дрэнна. Хаця ўсе яны знаходзяцца ў адным прававым полі.

Дырэктар фонду «Мінскаблмаёмасць» Антаніна Палякова больш падрабязна спынілася на аб'ектах, якія знаходзяцца ў камунальнай уласнасці. Амаль палову нявыкарыстаных складаюць сацыяльныя: былыя дзіцячыя садкі, школы, ваенныя гарадкі, фельчарска-акушэрскія пункты, клубы. Вёска старэе, дэмаграфія пагаршаецца. Сацыяльныя і культурныя ўстановы аптымізуюцца, закрываюцца, паколькі на іх утрыманне, ацяпленне, заробкі персаналу трацяцца немалыя грошы. У той жа час гэтыя будынкі стаяць паўпустымі або пустымі. Не выключэнне і збудаванні сельскагаспадарчага прызначэння: малочнатаварныя, жывёлагадоўчыя фермы, склады, рамонтныя майстэрні.

Як правіла, усе гэтыя аб'екты аддалены ад буйных гарадоў, населеных пунктаў, транспартнай інфраструктуры. У выніку адсутнічае цікавасць да іх з боку пакупнікоў. Палохае інвестараў таксама высокі кошт і працягласць перыяду падрыхтоўкі праектна-каштарыснай дакументацыі, правядзення будаўнічых работ. У ліку прычын нежадання набываць нерухомасць — зацягванне тэрмінаў перапрадажнай падрыхтоўкі аб'ектаў, няякаснае і нясвоечасовае афармленне дакументаў, што цягне за сабой позняе выстаўленне іх на таргі, не дазваляе на працягу года правесці іх паўторна, у тым ліку з паніжэннем першапачатковай цаны.

> Такія безгаспадарныя будынкі як магніт прыцягваюць дзяцей. Нягледзячы на забарону дарослых, яны ладзяць тут свае гульні і забавы, што можа закончыцца трагедыяй.

Як лічыць Антаніна Палякова, без дадатковых затрат з боку дзяржавы істотна змяніць сітуацыю цяжка. Пастаянна каля 40 % аб'ектаў нерухомасці пераходзяць у план наступнага года. Пры гэтым заўсёды ідзе працэс вызвалення іншай маёмасці. А ў выніку агульны пералік аб'ектаў, што не выкарыстоўваюцца, скарачаецца марудна...

У 2017 годзе планавалася прыцягнуць у абарот, закансерваваць і знесці 337 адзінак камунальнай уласнасці. Работы выкананы па 265. З дадзенымі паказчыкамі справіліся толькі ў Бярэзінскім, Барысаўскім, Клецкім, Салігорскім і Старадарожскім раёнах.

Летась за недастатковае прыцягненне ў гаспадарчы абарот нявыкарыстанай маёмасці меры дысцыплінарнай адказнасці прымяняліся да пяці кіраўнікоў.

Як адзначыла спецыяліст, на Міншчыне за тры папярэднія гады скарацілася колькасць аб'ектаў, якія выстаўляюць на аўкцыён з першапачатковай цаной у адну базавую велічыню. Аналіз паказвае, што адчужэнне нерухомасці за сімвалічную цану або бясплатна не прыносіць жаданых вынікаў. З 2008 па 2017 гады заключана 277 такіх дагавораў. З іх 62 скасаваныя. Нядобрасумленных уласнікаў, паводле заканадаўства, прыцягваюць да адміністрацыйнай адказнасці, ім павялічваюць стаўкі падатку на нявыкарыстаную маёмасць і зямельны падатак у дзесяць разоў.

Сярод асноўных прычын неэфектыўнага выкарыстання нерухомасці — няўзгодненасць дзейнняў службаў выканкамаў падчас планавання тэрмінаў выканання работ, адсутнасць каардынацыі работы ў далейшым.

На думку Антаніны Паляковай, праблемы можна пазбегнуць, калі дакладна вызначыць канкрэтныя тэрміны выканання задач. Неабходна таксама прызначыць адказных асоб, якія б кантралявалі ўсе этапы працэсу. Не трэба забываць і аб рэкламе — рухавіку прагрэсу, нагадала спецыяліст. Нядрэнна было б устанавіць расцяжку з каардынатамі, нумарамі тэлефонаў уласніка аб продажы аб'екта. Неабходна толькі яе падрыхтаваць, а распаўсюджвацца яна будзе бясплатна, як сацыяльная рэклама. Разам з тым сваю лепту ў агульную справу маглі б унесці і саветы па развіцці прадпрымальніцтва, якія маюць цесныя стасункі з бізнес-асяроддзем. Ім патрэбна своечасова даваць інфармацыю пра маёмасць, якая знаходзіцца на тэрыторыі рэгіёнаў. Ну, і нядрэнна было б часцей абнаўляць звесткі на сайце райвыканкамаў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

АКТУАЛЬНА

# ВЫНІШЧЫЦЬ НЕЛЬГА ПАКІНУЦЬ

**У Беларусі ў найбліжэйшыя два гады павінны звесці папуляцыю баршчэўніка Сасноўскага да мінімуму. Пачатак сапраўднай вайны з гэтай інвазіўнай раслінай абвясцілі намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Міхаіл РУСЫ і міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй ХУДЫК.**




Сёння ў Беларусі больш за 2900 га тэрыторый «захоплена» баршчэўнікам Сасноўскага. Сумнае лідарства належыць Віцебскай і Мінскай абласцям. Вельмі інтэнсіўна ідзе распаўсюджванне баршчэўніка і ў Мінску — у выпадках, калі для закладкі і рамонту газонаў выкарыстоўваецца глеба, нарыхтаваная ў месцах, дзе ён рос раней.

— Мінпрыроды як каардынатар мерапрыемстваў па навядзенні парадку на зямлі ажыццяўляе кантроль за барацьбой з інвазіўнай раслінай. Планамерная работа на працягу апошніх гадоў дапамагла стабілізаваць сітуацыю. А за два-тры наступныя гады неабходна значна знізіць плошчы баршчэўніка Сасноўскага, — падкрэсліў міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй Худык.

У сувязі з гэтым нядаўна на зялёнай сталічнай тэрыторыі побач з будынкам гарадской клінічнай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі адбылася наглядная дэманстрацыя барацьбы з баршчэўнікам Сасноўскага. Прысутным прадставілі метад знішчэння гэтай расліны з дапамогай гербіцыдаў. Былі прадэманстраваны і прэпараты айчыннага вытворцы, прызнаныя найбольш эфектыўнымі.



Нагадаем, што баршчэўнік уяўляе вялікую небяспеку для людзей. У перыяд цвіцення (з чэрвеня да жніўня) пры кантакце са скурай ён можа пакідаць апёкі.

— На тэрыторыі Мінска работа па рэгуляванні распаўсюджвання баршчэўніка Сасноўскага была начата восем гадоў таму. У 2011 годзе на падставе звестак, якія далі ўсе землекарыстальнікі, гарадскім камітэтам прыродных рэсурсаў была праведзена інвентарызацыя. Яна паказала, што плошча, якую займае баршчэўнік Сасноўскага, складае крыху больш за 242 га, — сказаў старшыня Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Сяргей Масляк. За сямігадовы перыяд дасягнуты пэўныя вынікі: сёння плошча, якая падлягае апрацоўцы, складае 138,1 га.

**Вольга ПРАЛЮК.**

БЕЗГАСПАДАРЧАСЦЬ

# НЕ АРАНДУЮЦЬ І НЕ КУПЛЯЮЦЬ...

**Карпусы былога домабудаўнічага камбіната ў Смаргоні з 90-х гадоў працягваюць разбурацца**

**У Камітэце дзяржкантролю Гродзенскай вобласці зацікавіліся лёсам завода. І адразу ўзніклі пытанні. Напрыклад, як здарылася, што будынкі былога камбіната, а іх больш за 20, ні разу не выстаўляліся на аўкцыён? Чаму ў бюджэт не паступае арэндная плата і падаткі на зямлю і нерухомасць?**

Як высветлілася, завод буйнапанэльнага домабудавання быў здадзены ў эксплуатацыю ў 1990 годзе, але ўжо праз чатыры гады стаў банкрутам і быў ліквідаваны. Для захавання маёмасці, а гэта 14 будынкаў, 7 збудаванняў і 11 адзінак абсталявання, было створана рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Надзея». Частка будынкаў пачала здавацца ў арэнду.

Каб не прастойвалі астатнія памяшканні, былы завод у пачатку 2000-х гадоў перавялі ў абласную камунальную маёмасць і зарэгістравалі як прадпрыемства па здачы ў арэнду. Права на зямлю і збудаванні заставаліся за былым уласнікам. «Надзея» ператварылася ў «Смаргонскую Надзею». Але і гэта не прынесла пэўных змен. Новыя арандатары так і не з'явіліся, а частку аб'ектаў наогул схавалі ад уліку і падаткаў.

— З-за часткова арандаваных плошчаў складвалася бачнасць паспяховага прадпрыемства, — канстатуе **начальнік аддзела кантролю дзяржаўнай маёмасці КДК Гродзенскай вобласці Дзмітрый ПАЛІВЁНАК.** — Кіраўнік і галоўны бухгалтар атрымлівалі значную зарплату, прэміі і іншыя выплаты, у тым ліку ўзнагароджанні па выніках гадавога развіцця прадпрыемства. Адзіным паказчыкам работы выконвалі план па арэндзе часткі плошчаў, які дырэктар сам сабе і зацвердзіў. А вось пустуючыя аб'екты ў справаздачу не заносілі, графікі ўцягнення ў гаспадарчы абарот не складалі. Адпаведна, і аўкцыёны па іх не праводзіліся.



Будынкі былога камбіната працягваюць разбурацца. Сетка цэнтральнага ацяплення не працуе. На працягу многіх гадоў часткова не працуюць электрычныя і водаправодныя сістэмы. І ніхто не звяртае ўвагі на прастой значнай часткі былога завода, адзначае супрацоўнік дзяржкантролю.

А між тым толькі за 2015—2017 гады прадпрыемствам «Смаргонская Надзея» ў выніку ўтойвання аб'ектаў нерухомасці не выплачаны падатак на нерухомасць у памеры каля 50 тысяч рублёў.

Таму дзяржкантролем вынесена рашэнне аб спагнанні гэтай сумы. Матэрыялы праверкі накіраваны старшыні аблвыканкама, а таксама ў Дэпартамент фінансавых расследаванняў КДК.

Па словах супрацоўніка дзяржкантролю, гэтая справа будзе накіравана ў суд для далейшага разгляду.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

ЗАЦІКАЎЛЕНЫ ПОГЛЯД

# ВЫРАШАЮЦЬ НЕ ТОЛЬКІ ГРОШЫ

**ПЕРШЫ ваенны гарадок Міністэрства абароны перадало на баланс Лепельскага райвыканкама яшчэ 20 гадоў таму. Цяпер вёска Бароўка нічым не адрозніваецца ад іншых населеных пунктаў, хіба што большая частка людзей на вуліцах прывыкла насіць ваенную форму. Заслонава пад догляд раённых улад трапіла куды пазней — у 2009 годзе. Як можна зразумець, розніца паміж гэтымі дзвюма вёскамі напачатку была відавочнай.**

**Ігар УРБАН, старшыня Лепельскага раённага Савета дэпутатаў,** сваю вайсковую службу праходзіў на Лепельшчыне, так што аб праблемах пражывання для афіцэрскіх сем'яў ведае з уласнага вопыту:

— Памятаю, мы з жонкай паспелі пажыць у «модулі» — аднапавярховым збудаванні з калідорнай сістэмай, дзе адначасова размяшчалася 16 сем'яў. Цяпер, вядома, умовы змяняюцца, хоць не без цяжкасцяў. Калі Заслонава толькі ўключылі ў спіс вёсак раёна, то разам з новым населеным пунктам мы атрымалі і «букет» тыповых праблем. Для іх вырашэння раёну наўрад ці хапіла б уласных сродкаў. Адчувальную падтрымку нам аказвае аблвыканкам.

**Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў,** пацвярджае, што абласныя ўлады насамрэч зацікаўлены ў аднаўленні вёскі.

— Мы разумеем, што трэба ўмацоўваць сацыяльную сферу, бо ўзбуйняецца адна з брыгад, размешчаных каля Заслонава. Мяркуецца, што на Лепельшчыну прыбудзе каля 600 ваеннаслужачых з сем'ямі. Патрэбна інфраструктура, што дасць прымальны ўзровень жыцця. У мінулым годзе скончыўся рамонт трохпавярховага дома на 70 кватэр. Пакуль што гэтага дастаткова, каб забяспечыць жыхароў жыллём. Цяпер асноўная падтрымка скіравана на капітальны рамонт школы — сёлета з абласнога бюджэту выдзелена для гэтай справы 500 тысяч рублёў. У Заслонаве заўсёды было шмат дзяцей, так што мне асабіста вядома пра недахоп месцаў у дзіцячым садзе. Як адзін з магчымых варыянтаў вырашэння праблемы можна прапанаваць перапрафіляванне часткі першага паверха школы — для размяшчэння там дашкольнікаў.

Што датычыцца станцыі абезжалезвання вады, то на яе ўсталяванне ўжо падрыхтавана праектная дакументацыя. Сітуацыю асабіста кантралюе начальнік упраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі Віцебскага аблвыканкама Юрый Дзядзеля.

Дарэчы, на кантролі ў вобласці знаходзяцца, бадай, усе буйныя праекты, звязаныя з Заслонавам.

Як лічыць **Васіль БАДЗЯЙ, старшыня Горскага сельскага Савета дэпутатаў,** актыўныя прапановы жыхароў ідуць вёсцы на карысць. Такім чынам улады скіроўваюць увагу на найбольш «балючыя» месцы. Напрыклад, па прапановах жыхароў сельвыканкамам запланавана ўсталяванне станцыі абезжалезвання вады на 2020 год.

— Людзі бачаць узровень жыцця ў Бароўцы, работа над якім ідзе даўно, і пачынаюць параўноўваць са сваім. Пры гэтым па-за ўвагай застаюцца іншыя населеныя пункты — аддаленыя вёскі, дзе сітуацыя можа быць больш праблематычнай. Я разумею, людзям хочацца адчувальных змен пастаянна, ад гэтага залежыць іх дабрабыт. Шкада толькі, што пры гэтым забываюцца мерапрыемствы, якія ўжо зроблены для вёскі. Пяць гадоў таму ў Заслонаве не было асфальтавай дарогі, моста цераз рэчку, цеплатраса губляла значную частку энергіі. Існавала праблема з вулічным асвятленнем і рамонтам будынкаў... Гэта ўсё ўжо выпраўлена, але работы па аднаўленні вёскі не скончаны.

Мясцовыя дэпутаты кажуць, што камфортнае пражыванне ў вёсцы можна наблізіць і без значных грашовых датацый.

— Цяпер мы будзем займацца арганізацыяй людзей на добраўпарадкаванне. Давядзём да ладу прыдамавыя тэрыторыі, магілкі — гэта малазатратная праца, якая поўнасцю ў нашых сілах, — мяркуе **дэпутат сельскага Савета Людміла БЫХАВЕЦ.** — Для больш маштабных змен неабходна дапамога. Раённыя ўлады могуць выдзеліць і рабочых, і сродкі на вялікі праект, але для таго, каб нас заўважылі, трэба праявіць актыўнасць. Тым, хто сам гатовы да змен, дапамагаюць куды больш ахвотна. Не толькі грошы вырашаюць, у якіх умовах мы будзем жыць.

# ПРАЗ ВАЕННЫ ГАРАДОК...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

— Гэта не прымусовая работа. Мы не ходзім па кватэрах з просьбамі ці пагрозамі, самае большае — дапамагаем з арганізацыяй, калі ёсць на тое патрэба, — расказвае дэпутат.

Адначасова вясковыя актывісты скардзяцца на недахоп дворнікаў. Два афіцыйна нанятыя чалавекі вымушаны абслугоўваць вельмі вялікую тэрыторыю. Асабліва адчуваецца праблема зімой, калі кожны ганак трэба пачысціць ад снегу і пасыпаць пяском.



Дворык, уладкаваны жыхарамі.

## Моладзь «на чамаданах»

На сходзе ў 2009-м мясцовыя жыхары вырашылі, што іх населены пункт атрымае статус менавіта вёскі. Такім чынам настаўнікі і медыцынскія работнікі маглі карыстацца надбаўкай да заробку, а школьнікі — ільготамі на харчаванне. Пад катэгорыю пасёлка ці гарадскога пасёлка ваенны гарадок не падыходзіў яшчэ і па крытэрыях, бо не меў дастатковага ўзроўню прамысловасці.

У 2012 годзе ў распараджэнне мясцовага раённага спажывецкага таварыства бязвыплатна быў перададзены будынак былога магазіна ваенсэрвісу. Існуе ўласная швейная вытворчасць, вытворчасць ветэрынарных прэпаратаў, спартыўнага харчавання, аднак гэтыя прадпрыемствы невялікія і не патрабуюць значнага штату работнікаў. Цяпер там працуюць кафэ і крама. **Старшыня раённага Савета дэпутатаў Ігар УРБАН заўважае,** што пошук работы — вельмі вострае пытанне для жонак ваеннаслужачых.

> Вельмі доўга праблемай заставалася аварыйная сітуацыя са школай. Кропкавыя рамонты ўжо не маглі выправіць сітуацыю.

— У першую чаргу мы арганізавалі транспартныя сувязі з райцэнтрам і іншымі населенымі пунктамі. Наладжаны распарадак руху аўтобусаў дазволіў жыхарам выязджаць на работу ў Лепель і вяртацца назад. Акрамя таго, расшырэнне воінскіх часцей, якое адбываецца апошнім часам, таксама ў нейкім сэнсе дае магчымасць уладкавацца.

Дзякуючы вёсцы Заслонава, Горскі сельсавет лічыцца самым маладым у раёне па ўзросце насельніцтва, нараджальнасць тут стабільна вышэйшая за смяротнасць. Вось толькі з добрых паказчыкаў схавана мясцовая спецыфіка размеркавання насельніцтва.

— Для моладзі мы як стартавая пляцоўка, — тлумачыць Людміла Быхавец. — Маладыя афіцэры прыязджаюць сюды, у іх сем'ях нараджаюцца дзеці. Гэта выдатна. Але потым для ваеннаслужачага з'яўляецца больш перспектыўная вакансія, і ён пераразмяркоўваецца ў іншы рэгіён. Атрымліваецца пастаянная «цякучка» і аднаведныя цяжкасці.

Чалавек, які хоча грунтоўна абсталявацца на адным месцы, пачынае думаць пра дабрабыт і найперш — уласную кватэру. А калі сям'я «жыве на чамаданах», то навошта ёй усур'ёз клапаціцца пра чарговы прыпынак на шляху? Тым не менш любое жыллё патрабуе ўвагі.

У канцы 2017 года жыхары вёскі ўбачылі вынік капітальнага рамонту шматкватэрнага дома. Раней ад будынка, фактычна, заставаўся толькі фасад, ён доўгі час стаяў законсерваваны. На грошы Віцебскага аблвыканкама быў заменены дах, адрамантаваны сцены, адноўлена каналізацыя, газа- і водазабеспячэнне. У выніку 70 сем'яў атрымалі новыя кватэры. Побач з адміністрацыйным будынкам мясцовыя ўлады мяркуюць абсталяваць вялікую дзіцячую пляцоўку з арэлямі, лавачкамі і месцам, дзе маглі б гуляць маці з малымі ў калясках.

## Вялікі рамонт

Яшчэ адзін аб'ект інфраструктуры, якім не сорамна пахваліцца — заслонаўскі дзіцячы сад. Першапачаткова будынак не быў прыстасаваны для дашкольнай установы — раней у ім размяшчаўся ваенны штаб. Пабудаваныя яшчэ ў даваенны час памяшканні патрабавалі капітальнага рамонту. Тры гады таму падрадная арганізацыя з Лепеля выканала работы па аднаўленні, пасля чаго ўстанова, можна сказаць, атрымала другое нараджэнне.

— Сюды прывозяць дзяцей не толькі з нашай вёскі, але і з суседняй Межыцы, — расказвае **Ларыса ШАСТАКОВА, загадчыца Заслонаўскага ясляў-сада.** — Ахвотных больш, чым мы можам размясціць. Так, установа разлічана на 55 дзяцей, сёлета у нашых спісах значыцца 57 выхаванцаў, а іншых малых бацькі запісваюць у Горскі дзіцячы сад.

Вельмі доўга праблемай заставалася аварыйная сітуацыя са школай. Сітуацыю з трохпавярховым будынкам, разлічаным на 800 навучэнцаў, кропкавыя рамонты ўжо не маглі выправіць. Закрыць установу таксама нельга было — на некалькі суседніх вёсак гэта адзіная школа. Летась, нарэшце, распачаўся капітальны рамонт. Сёлета на аднаўленне будынка выдзелена 500 тысяч рублёў з раённага і абласнога бюджэту. **Таццяна ІВАНОВА, дырэктар навучальнай установы і дэпутат раённага Савета,** правяла «экскурсію» па кабінетах.

> **Ёдовішча на першым і другім паверхах сапраўды сумнае. Рыпучая драўляная падлога, шчыліны ў дзвярах кабінетаў, старыя аконныя рамы... Найбольш кідаюцца ў вочы вялізныя шэра-рудыя падцёкі на столі і часткова — на сценах.**

— Як толькі на дах трапляла вада, у нас цякло са столі. А яшчэ здараліся перапынкі ў ацяпленні, так што захоўваць прымальныя ўмовы на занятках было цяжка, — падцвярджае дырэктар і запрашае... на трэці паверх, які ўяўляе з сябе «будучыню». Тут яшчэ пахне рамонтам. На падлозе ў калідоры і класах насцелены лінолеум, сцены пафарбаваны, столь пабелена, вокны радуюць шклопакетамі. Хоць вясновая вада ўсё яшчэ знаходзіць шчыліны і часам працсочваецца ў будынак.



Дзіцячы садок пасля рамонту.

Дырэктар мяркуе, што сапраўдныя рамонтныя работы пачнуцца з надыходам летніх канікулаў. Напачатку трэба асвоіць сродкі, выдзеленыя на рамонт, а потым можна падумаць і пра абнаўленне абсталявання.

## Доўгая дарога да амбулаторыі

Калі школа знаходзіцца ў цэнтральнай частцы Заслонава, то амбулаторыя размешчана на ўскрайку населенага пункта. На думку мясцовых дэпутатаў, гэта вялікая нязручнасць. Хворы чалавек, пенсіянер вымушаны пераадольваць вялікі шлях, а вось жыхарам суседніх вёсак, наадварот, дабірацца карацей. Людміла Быхавец марыць, што амбулаторыю і працэдурны кабінет удасца перанесці ў вёску, каб доўгая дарога не скасоўвала лячэбную сілу праведзеных дактарамі маніпуляцый.

— Напрыклад, пачынае чалавек захворваць. На бальнічны ісці рана, ды і не кожны можа дазволіць сабе такі «адпачынак». Можна было б запісацца на працэдуры, але як трапіць у амбулаторыю, калі яна дзесьці за вёскай? Тут альбо адпрошвайся ў начальніка з работы, займайся самалячэннем, альбо пераносы хваробу «на нагах». Атрымліваецца, маем добрых урачоў, але яны ў літаральным сэнсе «не на сваім месцы». Мы з ініцыятывай групай жыхароў прапаноўваем перанесці амбулаторыю на першы паверх аднаго з дамоў у вёсцы. Там якраз ёсць пустыя памяшканні.

У старшыні раённага Савета дэпутатаў Ігара Урбана сваё бачанне справы:

— Праблема з пераносам амбулаторыі не толькі ў грашах. Я лічу, што гэта наогул немэтазгоднае рашэнне. Для медыцынскай установы існуюць патрабаванні па размяшчэнні і абслугоўванні, падобнае суседства прынясе людзям нязручнасці, і зноў пачнуцца скаргі. Урачы не змогуць выкарыстоўваць некаторыя медыцынскія прыстасаванні, у будынку з'явяцца спецыфічныя пахі, будзе абмежаваны праход у пад'езде... Безумоўна, пераносіць аб'ект будзем, але пакуль для гэтага няма магчымасці.

Можа, на погляд старонняга чалавека, змены, што адбываюцца ў былым ваенным гарадку, у Заслонаве, не вельмі заўважныя, аднак мясцовая ўлада раіць ацэньваць аднаўленне вёскі ў маштабах раёна. Выканаць абсалютна ўсе работы за наступныя годдва немагчыма, аднак можна штогод па кроку змяняць сітуацыю.

**Матэрыялы падрыхтавала Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**

## Вольга НЯФЁДАВА:

# «МНЕ ВЕЛЬМІ КАМФОРТНА Ў ВЁСЦЫ»

**Вольга Няфёдава, якая іграе ў Купалаўскім тэатры і знялася ў дзясятках фільмаў, працавала на радыё, вядзе тэлеперадачу, канцэрты і здымаецца ў рэкламе, дасягнула, здаецца ўсяго, аб чым іншыя могуць толькі марыць. У той жа час сама Вольга ўпэўнена: яе энергіі хапіла б на большае. Аб нюансах акцёрскай прафесіі і нерэалізаваных пакуль жаданнях мы пагутарылі з актрысай.**



**— Вольга, паколькі мы з вамі размаўляем перад самым пачаткам спектакля, можна зрабіць выснову, што настройваецеся да выхаду на сцэну вы хутка...**

— У «Рэвізоры» ў мяне невялікая роля, тут своеасаблівай падрыхтоўкі не патрабуецца. Павінен быць добры настрой, і важна, каб ніхто яго не сапсаваў — вось і ўся настройка. Калі ў спектаклях у мяне больш сур'ёзныя ролі, прыходзіш загадзя, адкрываеш п'есу, хоць і памятаеш словы, усё роўна аднаўляеш іх у памяці.

**«Гала-канцэрт «Купальская казка» на свяце «Александрыя збірае сяброў» быў праектам тэлеканала АНТ. Я люблю з імі працаваць, гэта вельмі крэатыўная каманда».**

**— «Рэвізор» з аншлагам ідзе ў «Купалаўскім». У чым, на ваш погляд, сакрэт папулярнасці спектакля?**

— Некалькі гадоў таму, калі Мікалай Пінігін (мастацкі кіраўнік Купалаўскага тэатра. — **Аўт.**) ставіў «Пінскую шляхту», памятаю, як нам, акцёрам, раздалі сцэнарый, а там шэсць старонак, і незразумела, што і як іграць... Тады Мікалай Мікалаевіч нагадаў нам важную рэч: што класіка — гэта штосьці паказальнае, характэрнае, а тэма, якая падымаецца ў творы, — вечная. Той жа «Рэвізор» — пацвярджэнне гэтаму. Так, Мікалай Пінігін падаў яго ў новай, не класічнай форме, і ён гучыць актуальна. У гэтым і поспех.

**— Нягледзячы на тое, што роля ў «Рэвізоры» эпізадычная, вам удаецца стварыць незабыўны вобраз, а ваша харызма прарываецца нават з другога плана...**

— Харызма просіць галоўных роляў *(усміхаецца)*. На сцэне ў мяне проста добры настрой і нават стан куражу. Забаўляеш сябе, каб роля не ператварылася ў руціну, каб не было ў першую чаргу самой сумна.

**— Крыўдна, калі даюць не галоўныя, а эпізадычныя ролі?**

— Насамрэч рэжысёру лепш відаць, на якую ролю цябе запрасіць. З узростам усведамляеш, што акцёрская і рэжысёрская прафесіі вельмі розныя. Як у кіно, так і ў спектаклі рэжысёр бачыць прадукт цалкам, і ўсе акцёры, тыпажы збіраюцца для ўвасаблення яго адзінай думы. Мне крыўдна крыху іншае: што цяпер я не іграю ў стандартнай класіцы. Мне 48 гадоў, і я адчуваю, што апошнім часам засумавала па Астроўскім, Чэхаве — па той класіцы, дзе ёсць душа. Ад усемагчымых формаў у новых спектаклях я крыху стамілася.

**— Згаданая «Пінская шляхта», дзе вы бліскуча ўвасабляеце Куліну, чым не класіка?**

— Згодна, класіка. Але хочацца яшчэ больш гарачых пачуццяў — славянскіх, душэўных. Вельмі люблю трагікамедыю, калі ўсе спачатку смяюцца-смяюцца, а потым плачуць. Гэта мой жанр. Я ж не трагічная актрыса.

**— Прычым пры ўвасабленні нават сур'ёзных персанажаў вам удаецца дадаць нешта камедыйнае. Як, напрыклад, у дэтэктыве «Вечнае спатканне», дзе ў вас роля вельмі інтэлігентнай жанчыны, якая ў рэшце рэшт нават уступае ў бойку...**

— Я абажаю такія ролі: сур'ёзнай цёткі ў акулярах. Яны з мужам прыехалі ў вёску, дзе набылі дом, а тут нехта ўсіх забівае... Я вельмі люблю, калі рэжысёр, а гэта Уладзімір Янкоўскі, дае табе такі карт-бланш — рабі што хочаш. Тую ж сцэну бойкі мы прыдумалі самі — як варыянт таго, як магла паводзіць сябе інтэлігентная сям'я ў вёсцы.

**— У той жа ролі дырэктара Дома састарэлых у фільме «Доктар смерць» ваша гераіня — сур'ёзная жанчына пры пасадзе, якой, аднак нішто чалавечае не чужое. «Трэба праплаціць знаходжанне», — звяртаецца яна да сваякоў...**

— Рэжысёр Саша Назараў паставіў мне такую задачу: ты, Вольга, павінна быць Чарнамырдзіным гэтага Дома састарэлых — са стальной хваткай, таму я там навет размаўляю адрывіста. Ад працы з добрым рэжысёрам атрымліваеш кайф. Табе ставяць задачу, кажуць, што рабіць, а як гэта ўвасобіць, ты сам разумееш. Тады і атрымліваецца нешта добрае, магчыма, смешнае, магчыма, заразлівае.

**— Але ўсё ж такі патрэбны вялікі талент: сказаць літаральна дзве фразы, але так, каб яны сталі шэдэўрам. Як у кліпе гурта «Ленінград» «Адпускная»: «Валянцін, выбі дыван, вынесі смецце!»**

— Зноў-такі прыдумвалі разам з рэжысёрам некалькі варыянтаў: давай так зробім, давай гэтак. Прычым у кліп мяне спачатку спрабавалі на ролю адной з прадаўшчыц. Прыйшла на кастынг і кажу: я не падыходжу нават з-за ўзросту, але калі лічыце, што я — прадаўшчыца, калі ласка, давайце паспрабуем. А пасля мне патэлефанавалі і сказалі, што Сяргей Шнураў вырашыў, што я буду іграць ролю жонкі героя Вадзіма Галыгіна. А вось да нашумелага кліпа самога Вадзіка ў стылі «а-ля Ленінград» — маю на ўвазе «8 Сакавіка» — у мяне вельмі негатыўныя адносіны. Хоць па акцёрскіх работах усё вельмі здорава. Але такія дэбаты разгарнуліся нездарма, бо зроблены ён на мяжы пошласці, нават спаўзае ў пошласць. Гэта маё суб'ектыўнае меркаванне. Ды яшчэ гэта трасянка...



У серыяле «Сваты» (7-ы сезон).

**— «Рэвізор», між іншым, таксама ж на трасянцы...**

— У спектаклі гэта спецыяльны прыём, і ён не выклікае пошлых асацыяцый. У «Рэвізоры» трасянка дарэчы, бо ёсць пэўная мэта — падкрэсліць местачковасць. А ў кліпе як быццам бы сказалі: быдла ёсць быдла. Мяне таксама запрашалі здымацца, але я адмовілася адразу. Вадзік імкнуўся зрабіць сцёб, а атрымалася пошласць.

**— Рэжысёры часта эксплуатуюць ваш вобраз жанчыны, якая ў «пылаючую хату зойдзе». Наколькі вам у ім камфортна і ці не надакучвае?**

— Мне вельмі шкада, што ніхто не паклікаў мяне ў добрую трагікамедыю. Гэта такі жанр, якім валодае мала хто з акцёраў, эліта тэатра. Такі талент ёсць, напрыклад, у Віктара Манаева, Зоі Белахвосцік, Алены Сідаравай. І, зразумела, крыўдна, што мяне не выкарыстоўваюць у больш глабальных ролях у кіно. А там свае правілы: галоўная гераіня павінна быць лірычнай, бо ёй будуць суперажываць. Але, магчыма, у наступным жыцці я стану рэжысёрам.

**— Калі выбіраць паміж кіно і тэатрам, што вам бліжэй?**

Канфлікт узнік на бытавой глебе. Паліцыя затрымала 24-гадовую Тайцыю Кушман і 22-гадовую Брук Белтс. Кушман некалькі разоў ударыла Белтс кулаком, а затым узялася за патэльню і выкарыстоўвала яе як зброю. Пры гэтым Белтс здагадалася схапіць накрыўку ад патэльні і некалькі разоў ударыла ёю апанентку па галаве. З якой прычыны пачалася бойка, невядома. Зараз дзяўчаты знаходзяцца пад вартай у мясцовай турме.

**Іван КУПАРВАС.**

# КАНВЕРСІЯ ПА-ШЧУЧЫНСКУ:

## музей «халоднай вайны» ў бункеры і склад агародніны ў ангары

**Чаму малому бізнесу прыйшліся даспадобы былыя аб'екты авіяцыйнай базы**

**На былой авіяцыйнай базе зараз гаспадараць фермеры ды прадпрымальнікі. І тут ёсць дзе разгарнуцца. У спадчыну ад вайскоўцаў Шчучыну дасталіся 334 аб'екты. За чвэрць стагоддзя ўцягнута ў гаспадарчы зварот 317. Але ўлады на гэтым не спыняюцца, пастаянна шукаючы магчымасць задзейнічаць увесь былы ваенны патэнцыял.**

### Штаб авіяпалка — пад гандлёвы цэнтр

Многія прадпрымальнікі пачыналі з набыцця аднаго аб'екта. Адкрывалі там вытворчасць, але паступова да асноўнай справы далучаліся новыя віды дзейнасці. З'явілася неабходнасць пашыраць плошчы.

**Валерый Чупрына** *(на фота)*, былы ваенны лётчык, а зараз пенсіянер, якраз з ліку такіх прадпрымальнікаў. Зараз у яго некалькі будынкаў. Не так даўно выкупіў былы склад і кацельную. Цяпер мае штат больш за 30 чалавек.

— Мы плануем адкрыць яшчэ адзін від дзейнасці — турыстычны, — дзеліцца думкамі суразмоўнік, — тут паблізу ёсць узлётная паласа, якую можна задзейнічаць для лётных вандровак ці для прыёму турыстаў. Мы падтрымліваем яе ў лётнай прыгоднасці, ачышчаем, зрабілі водаадводы, сюды можна нармальна прызямліцца.

Валерый лічыць, што горад авіятараў мае вялікі патэнцыял для здзяйснення мар аб палётах усіх ахвотных. Дарэчы, у Шчучыне ёсць магчымасць у выхадныя дні праляцець на лёгкаматорным самалёце.



Свой першы аб'ект былой ваеннай базы набыў для захоўвання палівальных шлангаў, якія вырабляюцца ў Шчучыне. Трэба сказаць, вельмі своечасова намацаў гэтую нішу і ўдала яе заняў. Зараз прадпрыемства «Рына-Пластык» вядома не толькі ў раёне, але і ва ўсёй рэспубліцы. Кампанія актыўна выкарыстоўвае інтэрнэт-пляцоўку і правільна арганізоўвае лагістыку. Гэта дае магчымасць развівацца.

Паступова да вытворчых плошчаў далучыліся гандлёвыя. У райвыканкаме прапанавалі для гэтых мэт былы штаб авіяпалка. І хоць цяпер аб ім нічога амаль не нагадвае, будынак усё ж такі захаваўся і працуе на карысць як яго ўладальніка, так і ўсяго горада.

— Вядома ж, будынак быў у жахлівым стане, калі мы яго выкупілі, — кажа Валерый, — было даволі складана аднавіць камунікацыі, прывесці ўсё ў належны стан. Але мне, як былому лётчыку, было важна захаваць былы штаб авіяцыі, з якім звязана частка майго жыцця.

Зараз на першым паверсе крама з вялікім асартыментам тавараў для саду-агарода, другі паверх — для адміністрацыі і персаналу. Пакуль тут пуста, бо толькі нядаўна завершаны капітальны рамонт.

У другой палове будынка гаспадар мяркуе арганізаваць невялічкі гатэль для авіятурыстаў. Тут ёсць два пакоі для адпачынку і ўтульная гасцёўня з печкай-камінам і сталовай. Яшчэ адно памяшканне будзе займаць трэнажорная зала.

### Мармуровы фантан у райцэнтры?

Прадпрыемства «Шчучын Граніт» можна назваць сямейным бізнесам. **Яўген Куцель** *(на фота)* прызнаўся: сур'ёзную справу распачаў дзякуючы сыну. Спадзяваўся, што той яго падтрымае і застанецца пасля вучобы ў родным горадзе. Так і здарылася. **Сын Павел** не стаў шукаць шчасця ў іншых мясцінах, а невялікая саматужная майстэрня перарасла ў значнае прадпрыемства.



— Гэты будынак выкупілі праз аўкцыён за адну базавую велічыню. Адрамантавалі і атынкавалі фасад, завезлі абсталяванне — палiравальныя і каменедрабільныя станкі. Нядаўна набылі яшчэ адзін, дзякуючы банкаўскаму крэдыту. Мясцовыя ўлады дапамаглі з электрасеткай. Працаваць можна, — робіць вывад Яўген Мечыслававіч.

Па словах яго сына, камерцыйнага дырэктара Паўла Куцеля, выбралі былы ангар-лабараторыю, які падыходзіў па інфраструктуры і знаходзіўся за межамі горада. Абавязковымі ўмовамі таргоў было стварэнне працоўных месцаў і прадпрымальніцкая дзейнасць. Уласнікі ўстаноўку выканалі: зараз тут працуюць 15 чалавек, прадпрыемства паступова развіваецца.

— Раён паставак вялікі, — адзначае Павел, — асабліва многа заказаў са сталіцы на выраб сталешніц, падаконнікаў. А мармур, граніт купляем паўсюдна, зараз, напрыклад, будзем заключаць дагаворы з Індыяй і Іспаніяй. Хочам зрабіць нешта памятнае і для свайго горада, можа фантан.

### Ангары ў трэндзе

У горадзе авіятараў самымі адметнымі аб'ектамі з'яўляюцца, безумоўна, ангары, ці, як іх называюць тут, — арачнікі. Яны раскіданы па ваколіцы горада, і іх тут некалькі дзясяткаў. Як запэўнілі фермеры, у такіх памяшканнях вельмі добра захоўваць агародніну, бо пласт бетону і земляны насып дазваляюць трымаць стабільную тэмпературу амаль увесь год. Аб'ектамі карыстаюцца не толькі фермеры, але і сельскагаспадарчыя прадпрыемствы. Прадпрымальнік Міхаіл Будзіловіч арандуе некалькі ангараў. Пасля таго як упэўніўся, што выгадней набыць ва ўласнасць, чым плаціць арэнду, прыняў удзел у таргах і набыў аб'ект за 6 тыс. рублёў. Паралельна пачаў афармляць рэгістрацыю фермерскай гаспадаркі.

— Калі мы толькі пачалі браць у арэнду арачнікі, яны былі амаль не запатрабаваны, зараз інтарэс да іх значна ўзрос, таму і выкупілі адзін, — тлумачыць пазіцыю Міхаіл. — Гэта ўласнасць, якая не прападзе, бо ўласнік заўсёды глядзіць у перспектыву. Ангары будуць мець попыт, асабліва ў сезон збору ўраджаю.

Міхаіл, які па адукацыі аграном, хоча заняцца вырошчваннем збожжавых і бульбы, а таксама іх продажам. У раёне яму выдзелілі 60 гектараў зямлі. Праблемы са сховішчам вырашаны.

— Паколькі ангары ў добрым стане, работы па добраўпарадкаванні былі не такія стратныя,- — канстатуе суразмоўнік. — Канешне, прыйшлося дзесьці падрамантаваць — уцяпліць сцены, устанавіць новыя дзверы. Зімой, калі спатрэбіцца, можам карыстацца цеплавой пушкай, а летам ніякага халадзільніка не трэба. Такім чынам гародніна можа захоўвацца ўвесь год.

Ангары пакрысе набываюць гаспадароў, паведамілі ў аддзеле эканомікі Шчучынскага райвыканкама. Не так даўно чатыры з іх узяла ў арэнду фірма з Гродна. Ад яе ў даход раёна паступае штомесяц па 1 тыс. рублёў.

### Бункер — пад працоўныя месцы

У Шчучыне ўпершыню ў вобласці скарысталіся магчымасцю перадаць маёмасць у бязвыплатнае карыстанне пад стварэнне працоўных месцаў. Такі дагавор склалі адносна падземнага каманднага бункера, дзе інвестары прапануюць стварыць турыстычны аб'ект. Па словах начальніка аддзела эканомікі Шчучынскага райвыканкама Юрыя Вількевіча, тут ужо створана пяць працоўных месцаў. Згодна з праектам, у бункеры плануецца размясціць музей часоў «халоднай вайны».

Аб'ект сам па сабе ўнікальны. Ён пабудаваны ў 1977 годзе на выпадак вайны. Спецыяльны моцны каркас і пяціметровая тоўшча бетону павінны вытрымаць нават ядзерны ўдар. Двухпавярховы аб'ект складаецца са службовай і жылой частак, тут былі склады са зброяй, запасамі вады і ежы. Музей будзе максімальна набліжаны да дзейнага пункта.

— Трэба сказаць, што аб'ект знаходзіцца ў добрым стане. На пачатку 2000-х гадоў сакрэтны камандны пункт авіяцыйнай дывізіі законсервавалі і перадалі на баланс райвыканкама. Бункер увесь час быў пад аховай. Цеплаcеткі і энергазабеспячэнне ў асноўным у норме, — расказвае Юрый Вількевіч.

Вядома, не ўсе аб'екты ваенных гарадкоў, перададзеныя на баланс раёна, знаходзіліся ў такім стане. Значную частку, а гэта амаль 90 збудаванняў, прыйшлося папросту знесці, на чарзе яшчэ 44 аб'екты. Але асноўны фонд выкарыстоўваецца. Пры гэтым 60 аб'ектаў прадалі, амаль 100 — здалі ў арэнду альбо ў бязвыплатнае карыстанне.

Як паведаміў Юрый Вількевіч, раён адкрыты для інвестараў, гатовых заняцца любым відам дзейнасці. Тут не стварают ім перашкод, а, наадварот, робяць усё, каб бізнес развіваўся. Калі аб'ект купляюць па зніжаным кошце, патрабуюць толькі ўключэння ў абарот на працягу двух гадоў.

— Аб'екты ваеннай спадчыны даволі дарагія, за першапачатковы кошт рэдка ўдаецца прадаць, — тлумачыць Юрый Мечыслававіч, — але нам важна, каб гэтыя будынкі не разбураліся, а працавалі. Калі ёсць магчымасць прадаць аб'ект за базавую велічыню — прадаём.

Магчыма, у бліжэйшым горадзе ўсё ўжо было б распрадана, мяркуе Вількевіч. Новы віток попыту тут звязваюць з развіццём прадпрымальніцкага руху, а гэта значыць, могуць быць уцягнуты ў зварот былыя склады боепрыпасаў, ангары, іншыя ваенныя аб'екты. Іх у гэтым годзе дзевяць на чарзе.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

МЕРКАВАННІ

## ВЯРНУЦЬ ДЛЯ ЖЫЦЦЯ

**Там калісьці кіпела жыццё. Рыкалі маторы машын, гучна падымаліся ўвышыню самалёты, а салдаты па камандзе запявалі бадзёрыя песні. У спадчыну ад Савецкага Саюза нам засталіся шматлікія ваенныя гарадкі. Некаторыя з цягам часу ператварыліся ў закінутыя забудовы... Мы запыталі ў прадстаўнікоў улады і мясцовых дэпутатаў, як можна аднавіць і вярнуць жыццё ў былыя гарадкі вайскоўцаў?**

**Ігар ЖУК, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў:**

— У Гродзенскай вобласці гэтай праблемай займаюцца даўно. Не скажу, што яна поўнасцю вырашана, але паступовы рух у гэтым кірунку ідзе. Адзін былы ваенны гарадок аддалі для развіцця малога і сярэдняга прадпрымальніцтва. Свабодныя плошчы прывабныя для бізнесу. Іх выкарыстоўваюць для стварэння невялікіх прадпрыемстваў з новымі працоўнымі месцамі. У Шчучынскім раёне былыя ангары для самалётаў цяпер прыстасаваны для вырошчвання шампіньёнаў.

Акрамя гэтага, у нас ёсць пералік неэфектыўна выкарыстоўваемай маёмасці, па якой прымаюцца рашэнні. Пастаянна кантралюем гэтае пытанне, супрацоўнічаем з Дзяржаўным камітэтам па маёмасці. Летась праводзілі семінар для кіраўнікоў раённых Саветаў дэпутатаў па эфектыўным выкарыстанні дзяржаўнай маёмасці.

**Алег ЯЎСЕЕЎ, намеснік начальніка ўпраўлення архітэктуры і горадабудаўніцтва Баранавіцкага гарадскога выканаўчага камітэта:**

— Існуе паняцце «горадабудаўнічая дакументацыя». Да яе адносіцца і генеральны план. На яго аснове ствараюцца дэтальныя планы, дзе пазначана занальная функцыянальнасць плошчы. Калі ёсць ваенны гарадок і па дакументацыі на азначанай тэрыторыі магчыма размяшчэнне іншых аб'ектаў, гэта адзначаецца. Напрыклад, пабудаваны барак, але на яго месцы можа знаходзіцца фізкультурна-аздараўленчы комплекс. Гэта значыць, што толькі яго магчыма тут пабудаваць, а не гандлёвыя плошчы ці іншыя аб'екты. Усе абмежаванні па выкарыстанні тэрыторыі вызначаны горадабудаўнічай дакументацыяй. У Баранавічах ёсць плошчы былой ваеннай часці. Цяпер там вырашылі пабудаваць гандлёвыя аб'екты, і яшчэ частка будзе перапрафіляванa ў адпаведнасці з генеральным планам.

**Андрэй КІБЛОЎ, старшыня Магілёўскага гарадскога Савета дэпутатаў:**

— У Магілёве ёсць тэрыторыя былой ваеннай часці. Адтуль вывезлі ўсю ваенную тэхніку, разабралі пабудовы. Плошчу перадалі для ўзвядзення шматпавярховых жылых дамоў. Сёння ўжо пабудаваны два з іх, столькі ж яшчэ ў працэсе. У гэтых дамах будуць размешчаны кватэры для шматдзетных сем'яў. Частку аддадуць для арэнднага жылля. Астатнія квадратныя метры — гэта долевае будаўніцтва.

Наконт звычайных закінутых дамоў трэба адзначыць, што проста так яны не з'яўляюцца. Спачатку трэба прызнаць перадаварыйны стан збудавання, рассяліць жыхароў. Далей работа ідзе наступным чынам. Плошчай займаецца забудоўшчык, які прымае меры па зносе і ўзвядзенні там іншага аб'екта. У цэнтры горада старыя закінутыя забудовы аддаюцца камерцыйным структурам для стварэння гандлёвых, адміністрацыйных цэнтраў. Калі збудаванне немагчыма захаваць, яно зносіцца. Месца прыводзіцца ў парадак з перспектывай забудовы.

**Марыя ДАДАЛКА.**

МЯСЦОВЫ ЧАС

# АДРАСЫ ПРЫВАТНАЙ ІНІЦЫЯТЫВЫ,

## або Асаблівасці развіцця глыбінкі

**Шчарчоўскі сельсавет знаходзіцца ў лясной мясцовасці. Кіраўнік сельвыканкама Віктар ВАНЕКА гаворыць, што большая палова іх тэрыторыі пакрыта лясамі. З галоўных славутасцяў сельсавета — Свята-Нікольскі жаночы скіт Свята-Раства-Багародзіцкага жаночага манастыра. Сам манастыр знаходзіцца на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці — там ён не можа развівацца з прычыны абмежаванасці прасторы. Таму было прынята рашэнне будаваць скіт на мяжы Пружанскага і Камянецкага раёнаў побач з хутарам Вяжное, ведомым у акрузе гаючай крыніцай. А яшчэ тут ёсць вёска Стойлы, што засталася без свайго апошняга жыхара — вядомага майстра Мікалая Тарасюка, які ўвекавечыў сельскі побыт і родную зямлю ў драўляных фігурках. У вёсцы ёсць музей дзеда Тарасюка, пачаў зараджацца агратурызм.**

### КАМАНДЗІР БУТЭЛЕЧНАГА ЦЭХА

А раней жыццё Шчарчова вызначала буйная нават па мерках Савецкага Саюза вайсковая часць. Будынак КПП да гэтага часу стаіць на ўездзе ў населены пункт. Часць расфарміравалі не адразу з развалам Саюза. Вайскоўцы канчаткова з'ехалі адсюль недзе ў сярэдзіне 2000-х. Добраўпарадкаванне, санітарны стан тэрыторыі гарадка былі такімі, што камандзір часці ў свой час атрымаў за гэта ордэн.

— Мы з камандзірам хадзілі па тэрыторыі і ледзь не плакалі, калі ўсё вывозілі адсюль, думалі, паступова інфраструктура прыйдзе ў заняпад і зруйнуецца, як было з іншымі гарадкамі, — успамінае былы старшыня вайсковай часці Леанід КРУПКО.

Але ж слязамі тут не паможаш, дапамагчы можна справай — цяпер Леанід Ігаравіч гэта добра ведае. У адной з былых казармаў зараз размяшчаецца цэх па вырабе ПЭТ-бутэлек, якім ён кіруе. Цэх уваходзіць у структуру таварыства з абмежаванай адказнасцю «Шляхецкая маёмасць». Праўда, згаданае ТАА стала не першым арандатарам гэтага памяшкання — да беларускіх прадпрымальнікаў тут пабывалі замежныя гастралёры. Тое, што засталося пасля іх, Леанід Крупко па-філасофску вызначыў так:



Леанід КРУПКО і работніцы Ірына ЗАЛАТАРОВА і Наталля РАМАНЕНКА.

«Лепш вам не ведаць. Мы доўга вычышчалі ўсё і прыводзілі ў парадак». Затым пэўную суму грошай інвестар уклаў у рамонт, мянялі электраправодку, іншыя камунікацыі.

Цяпер на першым паверсе абсталяваны цэх, у якім на адмысловым станку жанчыны-рабочыя выдзімаюць з загатовак пластыкавыя бутэлькі зададзеных параметраў. Загатоўкі купляюць у Магілёве. Працуюць у асноўным пад заказ харчовых камбінатаў, вінзаводаў. Нават манастыр аднойчы закупіў партыю тары для вады і квасу. Так што прадукцыя карыстаецца попытам. Пакуль цэх невялікі, яго штат налічвае шэсць чалавек.

— Усе людзі мясцовыя, работай задаволеныя, — расказвае кіраўнік вытворчасці. — Па тэхналогіі тэмпература ў цэху павінна быць 28 градусаў цяпла, такая падтрымліваецца ва ўсе поры года. Значыць, працуюць людзі ў цяпле. Зарплата ў нас вагаецца ў межах 400 рублёў, што для нашай мясцовасці даволі добры паказчык. І яшчэ, што асабліва ацэнена працаўнікамі, графік работы яны складаюць самі. Жанчыны, адправіўшы дзяцей у садок, у школу, прыходзяць на змену, якая доўжыцца восем гадзін. А калі пачынаць яе — у восем, палове дзявятай ці ў дзевяць — яны вырашаюць самі.

За дзень цэх выпускае да васьмі тысяч бутэлек. Пашыраць вытворчасць тут мяркуюць не толькі ў зададзеным кірунку. Цяпер «Шляхецкая маёмасць» вывучае перспектыву ўстаноўкі ў былой казарме халадзільнага абсталявання, якое дасць магчымасць замарожваць ягады. Тады будуць створаны новыя рабочыя месцы, колькасць работнікаў вырасце.

### УНІФОРМА ПАД ЗАКАЗ

Самае першае прадпрыемства, што ўзнікла ў Шчарчове на тэрыторыі былой вайсковай часці і паспяхова працуе да гэтай пары, — ТАА «Уніформа». Цэх па пашыве рабочай спецвопраткі адкрыў у будынку былой казармы брэсцкі прадпрымальнік у 2006 годзе. Рэканструкцыю вайсковых памяшканняў рабілі сваімі рукамі тыя, хто хацеў там працаваць. Пачыналі з простых узораў. Спачатку шылі рабочыя рукавіцы.



Лідзія ДРОЗД і старшыня сельскага Савета Віктар ВАНЕКА.

Цяпер прадпрыемства складаецца з двух асноўных цэхаў. У адным шыюць рабочы абутак, у другім — адзенне. У майстэрнях устаноўлена японскае, італьянскае, нямецкае абсталяванне, якое дазваляе атрымліваць вырабы высокай якасці. Кліентамі «Уніформы» сталі многія вядомыя ў нашай краіне вытворцы. Цяпер на прадпрыемстве працуе каля 60 чалавек. Частка з іх мясцовыя жыхары, другая частка ездзіць на работу з райцэнтра. Начальнік вытворчасці Таццяна ЦІТОК праводзіць у цэх па вырабе абутку. Увагу прыцягваюць белыя туфлі. Аказваецца, гэта гатовая партыя абутку для малочнага прадпрыемства. У такіх камфортна будзе хадзіць па цэхах малочнага завода. Тут таксама выпускаюць боты павышанай устойлівасці з металічным падноскам, здольныя абараніць канечнасць чалавека пры падзенні грузу. Ёсць самыя розныя мадэлі і ўзоры.

На другім паверсе афармлена экспазіцыя для заказчыкаў, на якой прадстаўлены розныя ўзоры адзення — ад стыльных суконак гандлёвых работнікаў да касцюма зваршчыка, які вытрымае высокую тэмпературу.

Вытворчасць абутку, як вядома, справа даволі складаная. Але ў Шчарчове паспяхова асвоілі спецыяльнасці і мадэльераў, і шаўцоў. І паводле слоў Таццяны Ціток, «Уніформа» амаль поўнасцю працуе пад заказ.

### ПРАДУКЦЫЯ З ДРАЎНІНЫ

Калі «Уніформа» самае старое з прыватных шчарчоўскіх прадпрыемстваў, то ТАА «БелШпонДрэў» — самае новае. У памяшканнях ваеннага гарадка яно запрацавала ў 2013 года. Гэта прыклад прамых замежных інвестыцый. Грамадзянін Турцыі Саід Дзюльгер адкрыў тут прыватнае замежнае прадпрыемства па перапрацоўцы драўніны. Спачатку працавалі ўсяго тры чалавекі. Інвестар прыглядаўся да нашага заканадаўства і сітуацыі, улада на месцы прыглядалася да яго. І неўзабаве быў заключаны сумесны з аблвыканкамам інвестыцыйны праект «Мадэрнізацыя і рэканструкцыя ТАА «БелШпонДрэў» . Было ўкладзена 416 тысяч еўра інвестыцый, набытае абсталяванне для сушкі шпону, тэхніка. Цяпер прадпрыемства адпраўляе



Таццяна ЦІТОК дэманструе партыю абутку.

на экспарт не вільготную шпону, як было раней, а шпону высушаную, падрыхтаваную для мэблевай вытворчасці.

Дарэчы, на экспарт ідзе сто працэнтаў прадукцыі, спажыўцамі шпоны з Пружаншчыны з'яўляюцца кітайскія, польскія, турэцкія мэблевыя фірмы. Экспартныя пакачыкі раёну дапамагае выконваць менавіта гэта прадпрыемства, аб чым не без гонару паведамілі ў Шчарчове. На жаль, не ўдалося пагаварыць з кіраўніком і ўласнікам «БелШпонДрэва» Саідам Дзюльгерам, ён быў у ад'ездзе. Экскурсію для карэспандэнта правяла намеснік дырэктара Лідзія ДРОЗД.

Лідзія Іосіфаўна найперш падкрэсліла, што кіраўнік прасіў перадаць: Беларусь ён лічыць другой радзімай. А намеснік дырэктара вельмі ганарыцца сваім калектывам, які налічвае 19 чалавек. Амаль усе работнікі асвоілі сумежныя спецыяльнасці — яны ўзаемазамяняльныя. А такія, як Валерый Нічыпаровіч, Аляксандр Літвінаў, наогул універсальныя майстры. Яшчэ Лідзія Дрозд падкрэсліла, што гэта адзінае ў Беларусі прыватнае прадпрыемства, якое вырабляе шпону. Зарплата тут самая высокая з усіх прадпрыемстваў былога ваеннага гарадка. Працаўнікі атрымліваюць на рукі ад 500 да 600 рублёў.

### НА ПАЛЯХ І Ў САДАХ

Старшыня сельскага Савета Віктар ВАНЕКА заўважае, што ўсе прыватныя структуры, зарэгістраваныя на тэрыторыі сельсавета, удзельнічаюць у грамадскім жыцці вёскі. Маецца на ўвазе спонсарская дапамога пры правядзенні мерапрыемстваў, свята вёскі і іншае. «БелШпонДрэў», хоць і самая маладая структура, таксама праяўляе актыўнасць.

Варта адзначыць, што адрасы прыватнай ініцыятывы ў Шчарчове не абмяжоўваюцца тэрыторыяй былога ваеннага гарадка. Не так даўно з'явілася адкрытае акцыянернае таварыства «Сады Прыбужжа». Фірма зарэгістравана ў Мінску. Пружанскі райвыканкам прапанаваў інвестарам зямлю, бізнесмены афармілі дакументы. Неўзабаве быў высаджаны сад. Дырэктар прадпрыемства Юрый ВАЯВОДАЎ кажа, што цяпер асноўнай іх прадукцыяй з'яўляюцца яблыкі, яшчэ вырошчваюць клубніцы і пекінскую капусту.

Аграном Анатоль ПАЎЛЮЧЫК паказаў плантацыю яблынь. Сад зараз займае плошчу 20 гектараў. Дрэўцы літаральна праз дзень-два пакрыюцца кveценню. Пастаянна ў садзе занята некалькі чалавек. Летам па працоўным дагаворы наймаюцца іншыя работнікі. Прадукцыя ідзе на экспарт у Расію. Як відаць, «Сады Прыбужжа» асталяваліся тут надоўга. Сведчаннем таму ўчастак пад забудову, які атрымала прадпрыемства. Тут будуць узводзіць дамы для работнікаў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Пружанскі раён.*

**Старшыня Пружанскага раённага Савета дэпутатаў Мікалай КУДРАВЕЦ:**

— Шчарчоўскі сельсавет, асабліва вёска Шчарчова з насельніцтвам ў 450 чалавек, сапраўды з'яўляецца прыкладам развіцця прыватнай ініцыятывы. Акрамя шэрагу прадпрыемстваў, тут ёсць фермерская гаспадарка, працуюць прадпрымальнікі-кавалі. Яны адкрылі майстэрню па мастацкім каванні і выконваюць заказы для гарадскіх кліентаў. Адзін вясковы жыхар зарэгістраваўся як індывідуальны прадпрымальнік, узяў у арэнду невялікае памяшканне ўсё таго ж ваеннага гарадка і аказвае паслугі па мантажы шын. Так што названы сельсавет можа служыць пэўным арыенцірам для іншых у тым, як развіваць прадпрымальніцтва на сяле. Там сёння няма беспрацоўных, кожны, хто хоча, можа знайсці работу. На некаторыя вытворчасці людзей нават падвозяць з райцэнтра.

# БЕРАГ ПАД КАНТРОЛЕМ

**З КРАСАВІКА да кастрычніка ў Беларусі будуць праходзіць экалагічныя акцыі і мерапрыемствы: «Зробім!», «Тыдзень лесу», «Чысты двор», «Адновім зямлю разам», «Дапамажы прыродзе справай», «Чысты бераг», «Чысты вадаём», а таксама суботнікі, конкурсы і г. д. Іх асноўная мэта — прыцягнуць як мага больш людзей да навядзення парадку на зямлі. Менавіта таму да ўдзелу запрашаюцца органы дзяржаўнага кіравання, установы адукацыі, грамадскія арганізацыі і прадпрыемствы, а таксама ўсе неабыякавыя і зацікаўленыя грамадзяне.**



Дзмітрый ШУНЬКІН падчас правядзення рэйду па прыбярэжнай паласе.

Вялікую экалагічную кампанію «Уладкуем малую радзіму» распачаў і прыняў у ёй актыўны ўдзел **міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй ХУДЫК** — з акцыі па ўборцы і азеляненні Парку камянёў у Мінску:

— Нягледзячы на тое, што наша Радзіма светлая і чыстая, яшчэ ёсць дзе прыкласці намаганні, — адзначыў міністр.

На жаль, звалкі ў гарадскіх межах з'яўляюцца, асабліва ў месцах адпачынку. Аб гэтым расказаў (і наглядна прадэманстраваў падчас чарговага рэйду) **начальнік аддзела аператыўнага кантролю па Заводскім, Кастрычніцкім, Савецкім раёнах Мінскага камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Дзмітрый ШУНЬКІН:**

—У Кастрычніцкім раёне каля невялічкай ракі Лошыца збіраецца шмат смецця, і гэта не толькі шклянкі, бутэлькі і іншыя «прадукты жыццядзейнасці турыстаў». Тут і разрэзаны кабель, і будаўнічыя рэшткі, — апошнія з'яўляюцца з-за разбурэння моста.

Нагадаем, што ў прыбярэжнай паласе забаронена будаўніцтва практычна ўсіх аб'ектаў у 30-метровай зоне. А беспарадку не павінна быць не толькі ў водаахоўнай паласе, а наогул на тэрыторыі горада. Адходы неабходна своечасова прыбіраць, інакш будзе накіраваны адпаведны ліст Мінскзеленбуду. На прывядзенне тэрыторыі ў парадак даецца некалькі дзён. У выпадку невыканання прадстаўнік установы будзе выкліканы ў інспекцыю для дачы тлумачэнняў, а далей прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці.

У параўнанні з мінулым годам колькасць смецця ў горадзе значна зменшылася. Тым не менш хутка адкрыецца пляжны сезон, людзі пачнуць масава наведваць водныя аб'екты. Камунальныя службы, гарадскі камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя заклікаюць адпачывальнікаў не пакідаць смецце ў месцах адпачынку і не паркаваць аўтамабілі ў прыбярэжнай паласе.

— Апошнім часам колькасць такіх правапарушэнняў таксама зменшылася, думаю, уплываюць пакаранні. Даволі лёгка знайсці ўладальніка машыны каля возера ці ракі. Рэйды з міліцыяй будуць праводзіцца і ў гэтым сезоне — для таго, каб прадухіляць транспартныя заезды на пляж. Цяпер усюды ставяцца загараджальныя прылады, чырвоныя слупы. Іх наяўнасць дазволіла прадухіліць не толькі забруджванне водных аб'ектаў, але і няшчасныя выпадкі. За смецце каля прыбярэжнай паласы часцей за ўсё адказваюць камунальныя службы, якія замацаваны за гэтым участкам. Адказнасць за несанкцыянаванае выкідванне адходаў прадугледжвае папярэджанне або штраф ад 5 да 50 базавых на фізічную асобу, і да 1000 базавых на юрыдычную, — нагадаў начальнік аддзела аператыўнага кантролю.

Работнікі, якія ажыццяўляюць кантроль, аглядаюць вялікія гарадскія тэрыторыі (у тым ліку дваравыя і паркавыя), даюць прадпісанні, рэкамендацыйныя лісты. Паводле апошніх даных, небяспечных адходаў (ртутныя лямпы, акумулятары і іншыя) у водаахоўнай зоне не выявілі, але за мінулы год толькі па Мінску было выпісана каля 400 пратаколаў.

— Рэйд па кантролі за навядзеннем парадку на зямлі ў прыбярэжных і водаахоўных зонах водных аб'ектаў мы будзем ажыццяўляць разам з міліцыяй з 3 мая да канца жніўня. Звычайныя парушэнні, з якімі мы часцей за ўсё сутыкаемся, — несанкцыянаваныя стаянкі, выкідванне адходаў у прыбярэжных палосах. Што датычыцца забруджвання водаў, то, калі ёсць сігнал паступлення, напрыклад нафтапрадуктаў, наш камітэт выстаўляе рахунак за шкоду, нанесеную водным аб'ектам, — адзначыў Дзмітрый Шунькін. — Пры выяўленні смецця не толькі ў прыбярэжных зонах, але і ў сваіх дварах можна звяртацца ў тым ліку і да нас — абыходжанне з адходамі знаходзіцца і ў нашай кампетэнцыі.

**Вольга ПРАЛЮК.**



«Сляды» жыццядзейнасці чалавека...



## Извещение о проведении 85 открытого аукциона по продаже земельных участков в Солигорском районе 11 июня 2018 г.

| № лота | 1 | 2 |
|---|---|---|
| Предмет аукциона | Право заключения договора аренды земельного участка | |
| Адрес земельного участка | Солигорский р-н, Старобинский с/с, д. Листопадовичи, ул. Зеленая, д. 7 | г. Солигорск, ул. Лесная, район водоема |
| Кадастровый номер | 625086200601000394 | 625050100001002783 |
| Площадь, га | 0,1800 | 0,5100 |
| Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества (целевое назначение) | Размещение объектов усадебной застройки (строительство и обслуживание жилого дома) | Размещение объектов культурно-просветительного и зрелищного назначения, объектов общественного питания (строительство объекта культурно-просветительного и зрелищного назначения (с размещением кафе)) |
| Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории* | Имеется дорога с гравийно-песчаным покрытием, возможность подключения к сетям электроснабжения, газоснабжения | Имеется транспортная и инженерная инфраструктура |
| Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций и сооружений | Земельный участок расположен в водоохранной зоне водных объектов вне прибрежных полос – 0,1800 га | Земельный участок расположен в водоохранной зоне водного объекта – 0,5100 га, линий связи и радиофикации – 0,0336 га, линий электропередачи – 0,0169 га, сетей и сооружений водоснабжения – 0,0782 га, сетей и сооружений канализации – 0,1235 га, сетей и сооружений газоснабжения – 0,0610 га |
| Начальная цена продажи, руб. | 1 377,00 | 241 007,25 |
| Сумма задатка, руб. | 275,00 | 48 200,00 |
| Срок аренды земельного участка/условия продажи | 30 лет/см. пункт 6 | 30 лет/см. пункт 6 |
| Затраты на организацию и проведение аукциона, руб. | 73,50 | 73,50 |
| | + затраты на объявление в СМИ, оплата услуг аукциониста | |

*в разделе указаны коммуникации, к которым возможно подключение в указанном населенном пункте.

Продавец: Солигорский районный исполнительный комитет (далее – райисполком), 223710, г. Солигорск, ул. Козлова, 35.

Порядок проведения аукциона и порядок оформления участия в торгах определяются Гражданским кодексом Республики Беларусь, Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

1. Аукцион состоится в 15.00 11 июня 2018 г. по адресу: г. Солигорск, ул. Козлова, 35, зал заседаний райисполкома.

**2. Для участия в аукционе необходимо представить следующие документы:**

2.1. заявление на участие в аукционе по установленной форме; при подаче заявления представитель юридического лица должен иметь паспорт, доверенность на участие в аукционе и на подписание документов, физическое лицо (или его представитель, участвующий в аукционе по нотариально удостоверенной доверенности) – паспорт;

2.2. копии устава, учредительных документов, свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов (для юридического лица), копию свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования (для индивидуальных предпринимателей), копию паспорта, выписку об открытии в филиале 633 «АСБ Беларусбанк» лицевого счета для возврата задатка (для физических лиц);

2.3. документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на расчетный счет райисполкома (УНН 601061003) № BY75 AKBB 3641 0000 0429 7660 0000 в филиал 633 «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21633, с отметкой банка, не позднее срока окончания приема документов на участие в аукционе – 5 июня 2018 г.;

2.4. гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо заключает с райисполкомом соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по установленной форме.

3. По лотам №№ 1 и 2 осуществляется ежегодная уплата арендной платы согласно кадастровой стоимости земельного участка и его целевому назначению.

4. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с земельными участками и документацией. Осмотр земельных участков осуществляется претендентами на участие в аукционе самостоятельно либо в сопровождении специалиста землеустроительной службы райисполкома в согласованное время (рабочие дни) в течение установленного срока приема документов.

5. Аукцион по каждому лоту состоится при наличии не менее двух участников. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов максимальную цену.

6. Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:

– подписать протокол аукциона в день проведения аукциона;

– в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона внести плату за предмет аукциона (в счет оплаты засчитывается сумма внесенного задатка), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения;

– не позднее 2 рабочих дней после совершения оплаты заключить с районным (сельским) исполнительным комитетом договор аренды земельного участка и осуществить в двухмесячный срок после его заключения государственную регистрацию права на земельный участок;

– в течение одного месяца со дня осуществления государственной регистрации права на земельный участок обратиться в райисполком для получения разрешительной документации на проектирование и строительство объекта;

– в течение двух месяцев после получения разрешительной документации на проектирование и строительство объекта заключить договор подряда на выполнение проектных работ;

– обеспечить разработку проектно-сметной документации в сроки, установленные Положением о порядке определения продолжительности разработки проектной документации на строительство зданий и сооружений, утвержденным приказом Министерства архитектуры и строительства Республики Беларусь от 16 февраля 2005 г. № 40 «Об утверждении и введении изменения в технические нормативные правовые акты в строительстве»;

– согласовать и утвердить в установленном порядке разработанную проектно-сметную документацию в течение трех месяцев;

– юридическому лицу, индивидуальному предпринимателю не позднее 6 месяцев, а гражданину не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта приступить к освоению земельного участка;

– осуществить строительство жилого дома – в сроки, установленные законодательством, иного объекта – в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

**7. Документы на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Солигорск, ул. Козлова, 35, кабинет 244, с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по рабочим дням со дня опубликования настоящего извещения по 5 июня 2018 г. включительно.**

**Контактные телефоны: 8 (0174) 22 77 46, 22 55 23.**

# ДА ЛЕТА ГАТОВЫЯ!

## Што новае сёлета з'явіцца ў сталічных зонах адпачынку?

**КАЛІ вам здаецца, што пра гарадскія пляжы не ўспаміналі з заканчэння мінулага сезона, вы памыляецеся. Работа па добраўпарадкаванні — справа пастаянная, проста ў яе бываюць пікі актыўнасці. Позняя вясна — якраз адзін з іх. Пра тое, што ўжо зроблена, а што ёсць у планах на найбліжэйшы час, расказалі на прадпрыемстве «Мінская лесапаркавая гаспадарка».**

У ведамстве прадпрыемства знаходзіцца 20 зон адпачынку на чатырох вадасховішчах: Заслаўскім (якое ў народзе часцей называюць Мінскім морам), Цнянскім вадасховішчах, Драздах і Крыніца. Цалкам іх падрыхтоўка да летняга сезона завершыцца да 18 мая.

Кожны год на пляжах з'яўляюцца новыя альтанкі і стацыянарныя мангалы, дадатковыя урны і лаўкі. Так, сёлета ў зонах рэкрэацыі ўсталявалі 54 «грыбкі», 82 лаўкі, 111 урнаў. Для дзяцей абсталявалі дадатковыя гульнявыя комплексы. Цяпер пляцоўкі для гульняў можна знайсці практычна на кожным з 20 пляжаў. Паклапаціліся супрацоўнікі прадпрыемства і аб мінчанах, якія вядуць здаровы лад жыцця: існуючыя спартыўныя пляцоўкі дапоўнілі 15 новых трэнажораў. Устаноўка біяпрыбіральняў на пляжах пачнецца з 15 мая — іх колькасць у гэтым сезоне павялічыцца.

Па леташнім прыкладзе Цнянскага вадасховішча замянілі і старыя кабінкі для пераапранання на двух пляжах вадасховішча Драздаў і Мінскага мора. Яны значна зручнейшыя за сваіх папярэдніц: унутры ёсць сядзенне і перакладзіна, на якую можна павесіць рэчы. Зноў жа, па прыкладзе Цнянскага вадасховішча, у іншых зонах адпачынку з'явяцца велапаркоўкі — па дзве на кожным буйным пляжы.

Мабыць, самае нечаканае новаўвядзенне гэтага года — устаноўлена больш за паўтары сотні стацыянарных шэзлонгаў. У тапчаной будзе металічны каркас і драўлянае ложа. Апрабаваць навінку можна будзе на Мінскім моры, на вадасховішчах Драздзы і Цнянка.



Вялікая ўвага будзе ўдзяляцца не толькі стварэнню камфортных умоў для адпачынку, але і падтрыманню чысціні і парадку ў зонах рэкрэацыі. Так, летась для гэтых мэт набылі пляжаўборачную машыну. Яна прызначана для прасейвання пяску і выдалення з яго дробнага смецця. Дарэчы, рабочая глыбіня машыны даходзіць да 15 сантыметраў, а значыць, выдаляецца нават тое смецце, якое паспеў прысыпаць пясок. Самае спрыяльнае надвор'е для такой тэхнікі сухое, з вільготным пяскам работа ідзе трохі павольней. Аднак пакуль машына не можа цалкам замяніць чалавечую працу, таму зараз прадпрыемства наймае сезонных прыбіральшчыкаў, якія будуць дапамагаць падтрымліваць парадак на пляжах.

Ужо завершана ўладкаванне пад'язных дарог да зон адпачынку. Самі пляжы, у першую чаргу Цнянскае вадасховішча і Драздзы, таксама закранула абнаўленне. Тут падсыпана каля сямі тысяч квадратных метраў сеянага і мытага пяску.

Не застаўся па-за ўвагай і горад у цэлым. Толькі за час правядзення вясновага месячніка па добраўпарадкаванні і азеляненні гарадскіх тэрыторый, які праходзіў у красавіку, было прыведзена ў парадак больш за 16 тысяч гектараў гарадскіх тэрыторый. Як на аператыўнай нарадзе паведаміла **начальнік упраўлення гарадской гаспадаркі і энергетыкі Мінгарвыканкама Марына МАЛАЕВА**, з горада вывезлі каля 20 тысяч кубічных метраў смецця, адрамантавалі звыш 78 тысяч квадратных метраў асфальтавага пакрыцця, 1,8 тысячы прыпыначных навесаў і больш за 700 святлафораў, абнавілі дарожную разметку. Акрамя таго, было адрамантавана і пафарбавана 45 тысяч адзінак малых архітэктурных формаў і дзіцячага абсталявання. За месяц у сталіцы з'явілася 10 тысяч новых дрэў і 25 тысяч кустоў.

У цёплы перыяд на вуліцах горада будзе высаджана каля 1,8 мільёна летніх кветак. Дарэчы, сёлета, паводле слоў спецыялістаў «Мінскзеленбуда», будзе ўкаранёна новая форма азелянення — кветнікі з мнагалетніх і злакавых раслін. У цэлым у сталіцы імкнуцца ўжываць толькі расаду, устойлівую да агрэсіўнага гарадскога асяроддзя.

Мабыць, адным з самых цікавых «зялёных» праектаў можна назваць жывы лабірынт у выглядзе карты Беларусі. Яго высаджваюць у скверы Старасцінская слабада непадалёк ад гасцініцы «Беларусь». Кампазіцыя будзе складацца з трох тысяч хвойных кустоў вышынёй каля метра. Паглядзець на гатовы твор ландшафтнага дызайну можна будзе ўжо ў сярэдзіне мая.

**Дар'я КАСКО.**

### У тэму

Як паведаміў на аператыўнай нарадзе **начальнік упраўлення спорту і турызму Мінгарвыканкама Сяргей ФУРМАНАЎ**, ва ўсіх раёнах Мінска з'явяцца тыпавыя спартыўныя пляцоўкі, ужо вызначаны месцы для іх размяшчэння. Яны будуць складацца з міні-рампы, комплексу снарадаў для заняткаў і трэнажораў для пажылых людзей. Таксама запланаваны рамонт ужо існуючых пляцовак — да канца сезона мінімум адна пляцоўка ў кожным раёне будзе мадэрнізаваная. Дарэчы, спортам на пастаяннай аснове займаецца кожны чацвёрты мінчанін.


Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

| Извещение о проведении аукциона | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | | | |
| **Продавец** | Червенское районное потребительское общество | | | |
| **Предмет аукциона** | | | | |
| Наименование | Назначение | Общ. пл. | Инв. номер | Адрес |
| **Магазин № 2** | Здание специализированное розничной торговли | 427,9 кв. м | 615/С-16290 | Минская обл., Червенский р-н, г. Червень, ул. К. Маркса, д. 9 |
| Составные части и принадлежности: пристройка, два сарая пристройки, топочная | | | | |
| ***Сведения о земельном участке***: пл. **0,1793** га предоставлен на праве аренды по 29.01.2028 для обслуживания здания магазина № 2. Ограничения (обременения) прав – охранные зоны сетей и сооружений водоснабжения, пл. 0,0406 га | | | | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 148 101,84 бел. руб.** | | | | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, ул. Коллекторная, 11 БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона | | | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | | | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи | | | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by | | | | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | | | | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **14.06.2018** в 11.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | | |
| **Дата и время окончания приема документов** | **12.06.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | | |
| **Контактные телефоны** | **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by** | | | |

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

| Извещение о проведении повторного аукциона | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | | | |
| **Продавец** | Узденское РАЙПО, Минская обл., г. Узда, пер. К. Маркса, 7 | | | |
| **Предмет аукциона** | | | | |
| **Наименование** | **Назначение** | **Общ. пл.** | **Инв. номер** | **Адрес** |
| **Административное здание, кондитерский цех** | Здание административно-хозяйственное | 646,2 кв. м | 623/С-58122 | Минская обл., Узденский р-н, г. Узда, пл. Свободы, 9 |
| **Составные части и принадлежности** | Подвал, кирпичная пристройка | | | |
| **Сведения о земельном участке** | Земельный участок, общ. пл. 0,1481 га, предоставлен Продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания административно-производственного здания. Ограничения (обременения) прав: охранная зона ЛЭП до 1000 вт, площадь 0,0104 га | | | |
| **Начальная цена с НДС 20 %** | 83 787,77 бел. руб.(снижена на 62 %) | | | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с № 3012343260010 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки». В формате IBAN: р/с BY60BLBB30120191021390001001, БИК BLBBBY2X | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона | | | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | | | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | | | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by | | | | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | | | | |
| Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 13.02.2018 г. | | | | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **01.06.2018** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | | |
| **Дата и время окончания приема документов** | **30.05.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | | |
| **Контактные телефоны** | **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by** | | | |

Утерянные представительством Белгосстраха по Советскому району г. Минска бланки страховых полисов по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ №№ 2096461, 2160306 **считать недействительными**
УНП 100122726



МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.**
Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А.А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А.Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В.В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т.Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**
**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by
**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**
**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 10 мая 2018 года.**